

БЯСПЕКА — ТРЭНД ВЯСКОВАГА ЖЫЦЦЯ

САКРЭТЫ СТАРАЖЫТНАГА КРЭВА 19




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 КАСТРЫЧНІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 202 (29316)

+TVПРАГРАМА МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


# КАСТРЫЧНІЦКІЯ КВЕТКІ



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

Айцішніца з Мінска Вольга КЛУС — у Зеленаборскім лесе пад Смалявічамі.

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, выконваючы абавязкі міністра аховы здароўя:**

*«Узровень захваральнасці COVID-19 цяпер прыкладна ў два разы ніжэйшы ў параўнанні з вясновым перыядам. Гэта датычыцца і колькасці шпіталізаваных. Пачалася работа па перапрафіляванні ложкавага фонду на прыём «ковідных» пацыентаў. Мы чакаем, што сітуацыя будзе складаная. Але мяркуем, што тыя стандарты лячэння, якія былі выпрацаваны яшчэ вясной, дазволяць прайсці гэтую сітуацыю».*

**КОРАТКА**

- **Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у студзені—жніўні выраслі на 5,2 %.**
- Беларусь увайшла ў топ-20 краін па ўзроўні паштовага развіцця.
- **Рэгуляванне цэн на сацыяльна значныя тавары ў Беларусі працягнецца да канца года.**
- У гарадскім пасёлку Янавічы Віцебскага раёна аднавілі старадаўнія яўрэйскія могілкі. Лічыцца, што могілкам прыкладна 350 гадоў.
- **У нашай краіне выздаравелі і выпісаныя 78 583 пацыенты з COVID-19. Зарэгістравана 85 734 чалавекі са станоўчым тэстам на COVID-19. Усяго праведзена 2 144 544 тэсты.**
- Больш за 400 крымінальных спраў за парушэнне грамадскага парадку распачата ў Беларусі з 9 жніўня.
- **У Брэсцкай вобласці расце колькасць крадзяжоў з банкаўскіх картак. Агульная сума нанесенай трымальнікам банкаўскіх картак маёмаснай шкоды за 9 месяцаў перавысіла Br200 тысяч.**


ISSN 1990 - 763X


Будзьце здаровыя!

## «Нават самыя запушчаныя формы паспяхова лечацца»

### Анколагі расказалі пра самы распаўсюджаны ў жанчын від раку, генетычныя паломкі і імунатэрапію

**Штогод у Беларусі каля пяці тысяч жанчын захворвае на рак грудзей. Чаму гэта адбываецца, якія ў анкапацыентак шанцы паправіцца і чаму пастунова рак са смяротнага захворвання пераўтвараецца ў хранічнае, расказалі журналістам у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Сустрэча была прымеркавана да Сусветнага месячніка барацьбы з ракам грудзей, які з 1993 года праходзіць у кастрычніку.**

### Рак грудзей у жанчын — на першым месцы

Па прагнозах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у 2020 годзе на такі від анкалогіі ў свеце захварэе каля 15 мільёнаў жанчын, шэсць мільёнаў з якіх загіне. Рак менавіта гэтай лакалізацыі ў жанчын у многіх краінах свету знаходзіцца на першым месцы. І Беларусь у гэтай тэндэнцыі — не выключэнне.


СТАР. 4


Нашы людзі

## «МНЕ ХАЦЕЛАСЯ Б, КАБ БЕЛАРУСКАЯ ЛАЗНЯ СТАЛА БРЭНДАМ»

### По здароўе да знакамітага лазеншчыка Генадзя Мароза прыязджаюць з многіх краін свету



**Стаўленне да лазні ў розных людзей бывае дыяметральна процілеглае. Ёсць аматары «лёгкай пары», перакананыя, што парыльня і венік карысныя ў любым узросце і пры любым стане здароўя. Нямала і тых, хто лазню не любіць і не прымае. Пагаворым пра тое, ці сапраўды класічная паравая лазня нясе здароўе і даўгалецце? А экспертам выступіць заснавальнік штогадовых народных чэмпіянатаў і фестываляў па паранні ў нашай краіне, суддзя міжнароднай катэгорыі па спартыўным паранні, член Міжнароднай асацыяцыі лазневага мастацтва Генадзь МАРОЗ.**


СТАР. 5

З першых вуснаў

# «МЫ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ТАКОЕ АДКБ І ДЛЯ ЧАГО ГЭТА АРГАНІЗАЦЫЯ НЕАБХОДНАЯ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Станіславам Засем. Першай тэмай размовы стала ўнутрыпалітычная сітуацыя ў краіне.**

Па словах Прэзідэнта, заходнія «партнёры» залішне актывізаваліся і перабралі ў адносінах да Беларусі. Але кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што наконт падзей у краіне «асабліва не напружваемся, як гэта падаецца ў СМІ, але прыемнага тут мала».

«Ціхая, спакойная краіна. А вось у Мінску ніяк не можам падумаць, як жыць далей. Але, я думаю, мы з гэтым справімся. ***Справімся абавязкова, у гэтым няма ніякага сумнення.*** Унутраная сітуацыя не проста ўскладненая, галоўная прычына гэтай сітуацыі ўнутры абсалютна знешняя. Не было б знешняга ціску і ўплыву, ніколі б гэтага ў Беларусі не было. Але мы перажывалі ўсякае. У нас пасля чарговых выбараў то машыны палілі, то з заточкамі бегалі, то Дом урада штурмавалі», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што гэтым разам знешнія сілы пасля выбараў «разышліся на ўсю моц», і выказаў надзею — беларусы справяцца і разбяруцца ва ўсім.

Прэзідэнт падкрэсліў, што свет перажывае няпросты перыяд, але ён гэта ўсё прагназаваў яшчэ да выбараў. «Многія кажуць, што Прэзідэнт атрымліваў інфармацыю, аналізаваў, ведаў пра гэта. Да не, не было ніякай інфармацыі, што будзе пасля выбараў у нас, што будзе ў свеце ўвогуле. Але прагноз мой аказаўся на 100 працэнтаў дакладны і па пандэміі, і па сітуацыі, якая сёння складваецца. Нескладана было гэта спрагназаваць, нават не маючы аператыўнай інфармацыі», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуўся да тэмы існавання Дагавора аб калектыўнай бяспецы, адзначыўшы, што падзеі ў Беларусі і рэакцыя Расіі на іх падкрэсліваюць важнасць арганізацыі і неабходнасць яе развіцця.

«У маёй размове з Пуціным я якраз яму пра гэта сказаў: ***цяпер мы зразумелі, што такое АДКБ і для чага нам гэта арганізацыя неабходная.*** Мы вельмі дакладна ў свой час вызначыліся па нашай ваеннай дактрыне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заявіў, што дэманстрацыя ваеннай сілы абразуміла замежнікаў і пацвердзіла, што Беларусь «мае моцны кулак і можа сур'ёзна адказаць».

«***Таму АДКБ быць, мы будзем вельмі актыўна ўдзельнічаць у гэтым.*** Нават калі камусьці гэта будзе не на руку, мы ўсё роўна будзем працаваць, як гэта было пры «Славянскім братэрстве». Сербія адмовілася, але мы правялі выдатныя вучэнні з Расіяй. І зараз пад Віцебскам праходзяць вучэнні сіл АДКБ «Непарушнае братэрства — 2020». Гэта ў тым ліку і мой палігон: часта, калі я ў арміі служыў афіцэрам, мы там вучэнні праводзілі, таму гэта мне ў асабістых адносінах блізка», — успомніў Прэзідэнт.

Па яго словах, вельмі хочацца, каб у год беларускага старшынства ў арганізацыі генсек падштурхоўваў членаў АДКБ да актыўнай работы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ Каментарый у тэму

Станіслаў Зась расказаў кіраўніку краіны пра падрыхтоўку пасяджэнняў статутных органаў АДКБ і саміту кіраўнікоў дзяржаў.

«Ён запланаваны на 2 снежня ў Маскве. Распрацаваны парадак гэтага саміту, ён дастаткова насычаны, працуем над яго ўзгадненнем. Вельмі спадзяёмся, што ўдасца правесці яго з захаваннем бяспекі ў вочным фармаце», — сказаў ён.

Станіслаў Зась паведаміў журналістам, што пандэмія каранавіруса паўплывала на дзейнасць АДКБ. Арганізацыя вымушана была частку мерапрыемстваў правесці ў анлайн-фармаце ці перанесці на будучы год.

«Другая асаблівасць бягучага года (яна таксама сёння абмяркоўвалася) — няпростая сітуацыя ў нашых дзяржавах. Гэта і Беларусь, і абвастрэнне канфлікту ў Нагорным Карабаху, і падзеі ў Кыргызскай Рэспубліцы. На жаль, сітуацыя развіваецца ўсюды вельмі складана. Хоць у Кыргызскай Рэспубліцы падзеі ўваходзяць у прававое поле, і спадзяёмся, што ў найбліжэйшыя тыдні сітуацыя там стабілізуецца», — выказаў надзею генсек АДКБ.

Адзначае ён і паспяховыя спробы наладзіць дыялог паміж бакамі канфлікту ў Нагорным Карабаху, ідуць размовы і аб міратворцах у гэтым рэгіёне.

Абмяркоўвалі на сустрэчы таксама міратворчыя вучэнні, што ідуць гэтымі днямі ў Беларусі. Яны планавыя, ніяк не звязаныя з сітуацыяй у краіне. Па словах генсека, асаблівасць іх у тым, што амаль усе ўдзельнікі маюць вопыт міратворчых аперацый, упершыню на такіх мерапрыемствах разгортваюць міратворчую місію з ліку супрацоўнікаў сакратарыята АДКБ і аб'яднанага штаба.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Рэальны ўзровень беспрацоўя ў ЗША перавышае 26 працэнтаў




Такія даныя былі прадстаўлены амерыканскаму парталу навін Axios, паведамляе ТАСС. Паводле даных Міністэрства працы ЗША, узровень беспрацоўя ў краіне ў верасні скараціўся і складае 7,9 %. Аднак, паводле інфармацыі партала Axios, афіцыйныя звесткі аб беспрацоўі не ўлічваюць тых работнікаў, якія зарабляюць некалькі долараў у тыдзень, а таксама тых, хто перастаў шукаць работу або вымушаны замест работы даглядаць за дзецьмі падчас каранакрызіса. Калі ўключыць гэтыя катэгорыі, то ўзровень беспрацоўя ў ЗША складае 26,1 працэнта. Пры гэтым, калі лічыць кожнага амерыканскага грамадзяніна ад 16 гадоў, хто не можа забяспечыць сабе пражытковы мінімум, то колькасць беспрацоўных складае неверагодныя 54,6 %. У студзені, калі афіцыйны ўзровень беспрацоўя ў ЗША складаў 3,6 %, праўдзівы яе ўзровень быў у сем разоў вышэй — 23,4 %. Такія звесткі адлюстроўваюцца ў разліках Інстытута агульнага эканамічнага росквіту, заснаванага Юджынам Людвігам. Ён узначальваў Упраўленне кантралёра грашовага абарачэння ЗША (OCC) у 1993—1998 гадах. Юджын Людвіг адзначае, што катастрафічная сітуацыя з беспрацоўем у ЗША не новая. Такі паказчык у краіне знаходзіўся ў крызісным стане на працягу дзесяцігоддзяў, аднак гэта было ўтоена за афіцыйнымі лічбамі. Эксперт спадзяецца, што апублікаваныя звесткі аб рэальным узроўні падштурхнуць Кангрэс ЗША да рашучых дзеянняў па рашэнні гэтай надзвычайнай сітуацыі.

### Колькасць прыхільнікаў незалежнасці Шатландыі ўзрасла да рэкорднага ўзроўню



Больш за палову (58 працэнтаў) апытаных жыхароў Шатландыі выступаюць за незалежнасць рэгіёна ад Вялікабрытаніі, і гэта рэкордны паказчык, паведамілі СМІ са спасылкай на даныя апытання грамадскай думкі ад кампаніі Ipsos Mori. «Наша апытанне выглядае змрочна для юніяністаў (прыхільнікаў адзінства з Брытаніяй. — **«Зв.»**)», — заявіла кіраўнік дырэктар Ipsos Mori ў Шатландыі Эмілі Грэй. Пры гэтым 42 % рэспандэнтаў выступіла за захаванне Шатландыі ў складзе Злучанага Каралеўства. Таксама адзначаецца, што апытанне выявіла значную падтрымку Шатландскай нацыянальнай партыі (SNP), якую ўзначальвае першы міністр Шатландыі Нікола Сцерджэн: 72 % апытаных было задаволена тым, як яе ўрад спраўляецца з каранавірусным крызісам. Пры гэтым SNP выступае за незалежнасць Шатландыі ад Злучанага Каралеўства, а Сцерджэн паабяцала прадставіць графік новага магчымага рэферэндуму аб статусе рэгіёна да мая 2021-га, калі ў Шатландыі павінны адбыцца парламенцкія выбары. Як вядома, першы рэферэндум па пытанні аб незалежнасці прайшоў 18 верасня 2014 года. Тады 55 % шатландцаў прагаласавала за тое, каб Шатландыя засталася ў складзе Вялікабрытаніі.

### У Германіі прайшлі «таемныя вучэнні»



У ФРГ адбыліся сакрэтныя вучэнні па адпрацоўцы баявых дзеянняў з выкарыстаннем ядзернай зброі, паведаміла нямецкая газета Bild. Па інфармацыі выдання, вучэнні пад назвай «Стойкі поўдзень» адбыліся на авіябазе Нёрфеніх у зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія. Bild звярнула ўвагу, што трэніровачныя выпрабаванні праходзілі без спарадаў. У манеўрах таксама прынялі ўдзел нямецкія ВПС і іх саюзнікі па НАТА. У прыватнасці, як стала вядома, далучыліся галандскія, бельгійскія і італьянскія самалёты. Bild адзначае, што ў манеўрах былі задзейнічаны розныя знішчальнікі-бамбардзіроўшчыкі, якія здольныя несці ядзерную зброю. Галоўная мэта вучэнняў — адпрацоўка абароны ФРГ з выкарыстаннем атамных бомбаў, адзначае выданне. У артыкуле Bild прыводзіцца меркаванне, што на дадзены момант магчымасць і рызыкі пачатку ядзернай вайны нашмат вышэйшыя, чым за апошнія 30 гадоў. У якасці асноўнай прычыны разглядаецца выхад ЗША з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці.

## Блізкая ўлада

# Жыллё для шматдзетных, працаўладкаванне, зямельныя спрэчкі

### З чым звярталіся на прамую лінію да памочніка Прэзідэнта

**Больш за дваццаць званкоў паступіла на прамую тэлефонную лінію, якую правёў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА. Жыхары рэгіёна ўздымалі пытанні будаўніцтва жылля для шматдзетных, працаўладкавання, агучылі зямельныя спрэчкі.**

Шматдзетны бацька з аграгарадка Левашы падзяліўся: пераехалі ў Рэчыцкі раён у 2014 годзе з Луганскай вобласці Украіны. Трэцяе дзіця нарадзілася ўжо ў Беларусі. Тут сям'я плануе будаваць дом, аднак цяпер банкі прыпынілі крэдытаванне па ўказе № 240. Прапаноўвалася разгледзець варыянты жылля ў горадзе. «Але мы працуем у сельскай гаспадарцы. Хочам будавацца ў сельскай мясцовасці, у Левашах. Бо ёсць зямля, ёсць магчымасць трымаць дапаможную гаспадарку, прывучаць сваіх дзяцей да працы», — адзначыў мужчына. «Гэта пытанне будзе вывучана, будуць прапанаваныя варыянты», — паабяцаў Юрый Шулейка.

Пытанне будаўніцтва жылля хвалюе і шматдзетную сям'ю з Брагіна, якая ўжо ўзводзіць дом у райцэнтры. На прамой лініі мама растлумачыла, што на будаўніцтва дома заключылі дагавор з гомельскім падрадчыкам. Ужо зроблена «скрынка», пастаўленыя вокны, уваходныя дзверы, будаўнікі накрылі металапрофілем дах, аднак коміны не вывелі, не завяршылі работы на ганку, тэрасе, хоць гэта і прадугледжана дагаворам. «Атрымліваецца, што падрадчык да канца не выконвае свае абавязацельствы. Першапачаткова абяцалі зрабіць таннейшым будаўніцтва дома, але цяпер кажуць, што сродкі скончыліся. Абавязаліся зрабіць і хлеў, але нават не пачыналі. Падкажыце, як правільна зрабіць, куды звярнуцца», — цікавілася жанчына. Паводле яе слоў, сям'я паведаміла пра сітуацыю ў мясцовы райвыканкам, праваахоўныя органы, усю ідзе праверка, але перажываюць, каб падрадчыкі не пакідаюць. Па даручэнні памочніка Прэзідэнта спецыялісты вывучаць усе абавязацельствы забудоўшчыка, дакументацыю.

Пенсіянерка з аграгарадка Рагінь Буда-Кашалёўскага раёна панаракала, што арэндны дом, у якім яна жыве, у аварыйным стане. Ранейшыя жыхары не рабілі рамонту. Печ няспраўная, трубы ржавыя. «У доме вельмі холадна. На зіму не ведаю, куды дзецца», — апісала сітуацыю жанчына, адзначыўшы, што пяць гадоў стаіць на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. «Ёсць паняцце арэнднага жылля, вызначаная адказнасць бакоў. Будзем вывучаць ваша пытанне, умовы, шукаць варыянты», — адказаў Юрый Шулейка.

Патэлефанавала жанчына з Добрушскага раёна, расказала, што ў спадчыну ў Цераховцы ёй дастаўся дом. На вуліцы, дзе знаходзіцца будынак, калісьці была арашальная сістэма. «Цяпер гэтая канава ператварылася ў велізарны яр. Дарога памяняла свой напрамак, наблізілася да маёй брамкі, асфальт ляжыць у канаве. Яе падсыпалі жвірам, грунтам, але праблема не вырашаецца», — расказала гаспадыня. Юрый Шулейка адзначыў, што выедзе па адрасе са спецыялістамі, каб на месцы разгледзець спосабы вырашэння пытання.

З просьбай аб дапамозе патэлефанавала на прамую лінію былая работніца банка. Сёлета яна была звольненая: штат скарачалі з-за рэарганізацыі. У банкаўскай сістэме жанчына прапрацавала амаль 28 гадоў. На момант скарачэння да пенсійнага ўзросту ёй заставалася крыху больш за год. Гамяльчанцы прапанавалі ў банку іншы варыянт работы, але ён жанчыне праз шэраг прычын не падыходзіць. «Я адна выхоўваю дачку-студэнтку, яна на трэцім курсе. Я не па сваёй волі сышла і гатовая працаваць», — сказала жанчына. Варыянты дапамогі даручана прапрацаваць спецыялістам. Пытанні працаўладкавання гучалі таксама з Петрыкаўскага, Рагачоўскага раёнаў.

Зямельная спрэчка трывожыць гамяльчанку. «Суседка заняла ў мяне паўметра зямлі, і атрымліваецца, што вугал майго дома стаіць на яе зямлі», — падзялілася праблемай жанчына. Паводле яе слоў, разгляд доўжыцца ўжо год. Даручэнне Юрыя Шулейкі адказным службам — пераправерыць межы зямельных участкаў. У размове з журналістамі памочнік Прэзідэнта дадаў, што пытанне ўстанаўлення межаў зямельных участкаў паміж суседзямі гучыць практычна на ўсіх прыёмах і прамых лініях. Тэма заўсёды патрабуе глыбокага вывучэння, часцяком — і дыялогу паміж бакамі, падкрэсліў ён.

Жыхары рэгіёна таксама цікавіліся перспектывамі працягу будаўніцтва корпуса абласной інфекцыйнай бальніцы, прапаноўвалі даць адной з вуліц вёскі Колкі Петрыкаўскага раёна імя Героя Савецкага Саюза Івана Самбука.

Юрый Шулейка звярнуў увагу: прамыя тэлефонныя лініі асабліва актуальныя як форма зносін з грамадзянамі ў цяперашняй эпідсітуацыі. «Прамыя лініі доўжацца тры гадзіны. Людзі маюць магчымасць дэталёва выкласці пытанне. У працэсе зносін вызначаюцца адрасы, па якіх трэба выехаць, прыцягнуць спецыялістаў, а таксама праблемы, якія патрабуюць дасканалага, глыбокага вывучэння, па некаторых тэмах даюцца тлумачэнні, адказы», — падкрэсліў памочнік Прэзідэнта.

**БелТА.**

Імёны

# ДЗЯКУЙ, ДЗЯДЗЬКА РЫГОР

**Ці задумваліся вы, чаму творы Рыгора Барадуліна так падабаюцца і малым, і дарослым? Падчас сустрэчы, прысвечанай 85-годдзю паэта, што прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, школьнікі з розных куткоў нашай краіны дзяліліся сваімі ўражаннямі, звязанымі з вершамі класіка.**



Дзеці стваралі плакаты і цыталі класіка.

— Хачу выказаць шчырую падзяку дзядзьку Рыгору, што звяртаў нашу ўвагу на сапраўдныя жыццёвыя каштоўнасці, якія вучаць чалавека паважаць сябе і іншых, быць інтэлегентным, кахаць і верыць сапраўды, а не напаказ, — заўважыла Марыя Царова. Яна ўпэўнена, што ў час гаджэтаў і пагоні за «лайкамі», ісціны, пададзеныя ў вершах класіка, становяцца актуальныя як ніколі.

Марыя — адна з удзельнікаў творчага конкурсу, арганізаванага Нацыянальнай бібліятэкай. Супрацоўнікі галоўнай кніжнай скарбніцы заўважылі, што на творах Рыгора Барадуліна можна выхоўваць дзетак, што цытаты з яго вершаў здольныя пераварочваць свядомасць, абуджаць маленькіх чытачоў да ўсведамлення важных пытанняў, пошуку сэнсаў чалавечага жыцця. Яны прапанавалі школьнікам выбраць любімыя радкі з вершаў класіка і паразважаць на тэмы, якія закрануў паэт. І на такую прапанову адгукнуліся вучні з усёй краіны.

Так, на свята «Барадулін у нашых сэрцах» сабраліся школьнікі з Мінска, Брэста Магілёва, Пастаў, Рэчыцы, Баранавіцкага раёна. Аказалася, што сучасных дзяцей многія вершы класіка клічуць да дыялогу. Дзеці асэнсоўваюць думкі дзядзькі Рыгора і разумеюць, што ён пакінуў ім у спадчыну адказы на вельмі многія хвалюючыя пытанні.

Марыя Каралёва ў вершах класіка шукала адказы на тэму «што такое каханне», Тэрэза Баранава з вёскі Застарынне Баранавіцкага раёна пісала эсэ, на якое яе натхніла цытата з верша Барадуліна «Родны край ніхто не выбірае, выбірае родны край цябе». А яе сяброўку Арыну Нахват зачапіла тэма вайны, дзяўчынка разважала над радкамі паэта «П'е чалавечую кроў, харчуецца людствам вайна».

Была даслана на конкурс і адна вершаваная работа — такую форму для свайго эсэ абраў Ілья Талстыка з вёскі Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна. Хто ведае, можа з гэтага адкрытага хлопчыка, сэрца якога адгукнулася на вершаваныя запаветы Рыгора Барадуліна, таксама вырасце цудоўны паэт. Усё ж дзядзька Рыгор даў літаратурную пуцёўку ў жыццё не аднаму пісьменніку.

На сустрэчу ў Нацыянальную бібліятэку завіталі сябры Рыгора Барадуліна. Пазнаёміцца з юнымі аматарамі творчасці пісьменніка прыехала і яго ўдава. Валянціна Міхайлаўна прызналася: «З Рыгорам было весела жыць. А цяпер сумна. Не стала і маёй адзінай дачкі, пасыходзілі ўжо яго сябры, і сёння мой адзіны суразмоўца — стары руды кот. Вялікі дзякуй, што вы сабраліся ўспомніць майго Рыгора, ён быў бы дужа шчаслівы». Менавіта такія сустрэчы дазваляюць зразумець, што Рыгор Барадулін застаецца з намі. У нашых сэрцах, нашых думках, нашых марах.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота аўтара.**

# ПЫТАННІ СЯРЭДЗІНЫ ВОСЕНІ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 17 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# У НЯДЗЕЛЮ ЎЖО АД МІНУС 3 ДА 9 ГРАДУСАЎ ЦЯПЛА

### Такі сутачны тэмпературны фон на 1—3 градусы ніжэйшы за кліматычную норму гэтых дзён кастрычніка

**Вось і ўсё. Мінулая серада стала заключным анамальна цёплым днём восені. А далей у выхадныя ў нашай краіне будзе гаспадарыць больш жорсткае, халоднае надвор'е, калі ўначы магчымы нават мокры снег, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ужо сёння максімальная тэмпература паветра будзе ўсяго ад 5 да 12 цяпла. Далей — толькі халадней. У суботу наша тэрыторыя будзе знаходзіцца ў халоднай няўстойлівай паветранай масе, калі ўдзень па паўднёвым усходзе краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Чакаецца, што будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі па Беларусі, а ўдзень на большай частцы Гомельскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласцей пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж, але па поўначы ў некаторых раёнах не выключаны першы ў гэтым сезоне мокры снег. Вецер прагназуецца паўночны, паўночна-ўсходні ўмераны, удзень па паўднёвым усходзе парывісты. Першыя восеньскія замаразкі прыйдуць да нас уначы ў суботу, калі тэмпература паветра будзе ад нуля да плюс 7 градусаў, пры працяглых праясненнях — 1—2 марозу. Удзень у суботу прагназуюць ад плюс 3 градусаў да 10 цяпла.

На наступны дзень захаваецца ўплыў халоднай няўстойлівай паветранай масы арктычнага паходжання. У нядзелю аблокаў будзе аж зашмат. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу з мокрым снегам. Вецер будзе паўночны з пераходам на заходні парывісты, удзень па паўночным захадзе месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, удзень чакаецца ад плюс 2 да плюс 9 градусаў.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца ўплыў халодных паветраных мас. І ў панядзелак месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Увага! Уначы і раніцай у панядзелак месцамі магчымы слабы галалёд. Вецер будзе заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, пры праясненнях — 1—3 марозу. Удзень чакаецца 3—10 цяпла. Такі тэмпературны фон на 1—3 градусы ніжэйшы за кліматычную норму, але... Нашы сіноптыкі так нясмела абяцаюць, што ў сярэдзіне наступнага тыдня халоднае паветра пакіне тэрыторыю краіны, стане холадна, але не марозна. Усё таму, што тэмпература вернецца ў сваю кліматычную кастрычніцкую норму.

У панядзелак з раніцы магчымы слабы галалёд.

**Сяргей КУРКАЧ.**

З нагоды

# СТО СЕМ ГАДОЎ НА КАРЫСЦЬ НАВУКІ

**Галоўная кузня педагагічных кадраў на Магілёўшчыне — дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова — адзначыў сваё 107-годдзе. Сёння тут на сямі факультэтах вучацца каля 5 тысяч чалавек, у тым ліку паўтысячы завочнікаў і замежных студэнтаў. Сярод яго выпускнікоў шмат вядомых людзей. Менавіта тут у 1975 годзе дыплом выпускніка гістарычнага факультэта атрымаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.**

На працягу тыдня ва ўніверсітэцкіх сценах праходзілі святочныя мерапрыемствы, сустрэчы з былымі выпускнікамі, спартыўныя спаборніцтвы. Чацвёра выкладчыкаў атрымалі высокія ўзнагароды за ўклад у развіццё гэтай навучальнай установы, а найлепшым выкладчыкам года названы прафесар кафедры археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных дысцыплін **Пётр ДЗМІТРАЧКОЎ**. Універсітэт ідзе ў нагу з часам — сёлета тут упершыню набралі будучых праграмістаў.

— Гэта першая інжынерная спецыяльнасць, па якой мы пачалі падрыхтоўку, — адзначыў **рэктар МДУ імя А. Куляшова Дзяніс ДУК**. — Яна цалкам адлюстроўвае профіль нашага ўніверсітэта і вельмі важная для яго далейшага лічбавага развіцця. Мы і надалей будзем рухацца па шляху адкрыцця новых, запатрабаваных у сацыяльна-эканамічнай сферы спецыяльнасцяў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Цэны

# ЗА МЕСЯЦ БУЛЬБА ПАТАННЕЛА АМАЛЬ НА 12 %

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў верасні ў параўнанні са жніўнем склаў 100,9 %, паведамляюць спецыялісты Нацыянальнага статыстычнага камітэта.**

А вось змяненне сённяшніх цэн да цэн верасня мінулага года (гадавая інфляцыя) роўнае 6,1 %. Калі гадавая інфляцыя па харчовых таварах у 5 % якраз адпавядае запланаваным паказчыкам Нацбанка (5 % — цэны снежня гэтага года да снежня мінулага), то нехарчовыя тавары за год падраслі ўжо на 6,8 %, а паслугі — на 6,9 %.

Нягледзячы на тое, што ў нас цяпер у разгары сезон сельскагаспадарчых кірмашоў, у цэлым па статыстыцы гародніна падаражэла на 3,3 %. І гэта пры тым, што «асноўная» гародніна, якую мы запасаем на зіму, у верасні крыху патаннела. Знізіліся цэны на свежую белакачанную капусту, буракі, моркву і салодкі перац. Падзенне цэн на бульбу было самае максімальнае —11,8 %. Але вынікову статыстыку «падпсавалі» новыя цэны на свежыя агуркі і памідоры (плюс 31,5 % і плюс 24 % адпаведна).

Акрамя бульбы, сезонна патаннелі прасяныя крупы (мінус 2,9 %) і грэчка (мінус 1,7 %), а таксама нязначна — ячныя крупы (мінус 1,4 %), рыбныя паўфабрыкаты, кава (мінус 0,7 %), кефір (мінус 0,3 %) і ёгурт (мінус 0,2 %).

За мінулы месяц з мяса прыкметна падаражэла свініна, у сярэднім яна стала даражэйшая на 3,1 %. Таксама больш сталі каштаваць такія прадукты, як алей (плюс 2,6 %), морапрадукты, аўсяныя шматкі (плюс 2,2 %), шліфаваны рыс (плюс 2,1 %), курыныя яйкі (плюс 2 %), куры і макароны (адпаведна — плюс 1,2 % і плюс 1 %). Рыба і рыбныя прадукты ў цэлым падаражэлі на 2,2 %.

Сярод непрадуктовых тавараў у верасні сталі даражэйшыя электрасокавыціскалкі і бытавыя электрычныя радыятары (плюс 6,1 %), а таксама абутак (плюс 5,3 %) і гаспадарчае мыла (плюс 4,5 %). Мэбля ў цэлым падаражэла на 3,5 %. Затое патаннелі абрусы (мінус 1,1 %), мыйныя сродкі (мінус 0,5 %) і пакрывалы (мінус 0,4 %).

**Сяргей КУРКАЧ.**


27 октября 2020 года в 14.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О совершении сделок.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 14.00 до 14.30 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 19 октября 2020 г.

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 19.10.2020 г., по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400078331

# «Нават самыя запушчаныя формы паспяхова лечацца»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Агульная захваральнасць на рак малочнай залозы сярод жанчын знаходзіцца на першым месцы. Штогод мы рэгіструем каля пяці тысяч новых выпадкаў, і так было ў 2019 годзе. Рак грудзей займае 10 % у агульнай структуры анкалагічных хвароб, — расказвае **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, доктар медыцынскіх навук Сяргей ПАЛЯКОЎ**. — Важна адзначыць, што праграмы ранняга выяўлення, скрынінгі дапамагаюць выявіць захворванне ў большай частцы пацыентак у пачатковай форме. На 1-2-й стадыях рак малочнай залозы знаходзяць у 75 % пацыентак. Больш за 90 % такіх жанчын цалкам вылечваюцца і пераадольваюць пяцігадовы парог выжывальнасці. Пры запушчаных формах, а іх, на жаль, пакуль яшчэ шмат, толькі 17 % жанчын удаецца пражыць пяць і больш гадоў. Гэта малая лічба, але дзякуючы новым метадам лячэння і сістэмнай тэрапіі гэты працэнт таксама паступова павялічваецца. Нават позняя стадыі мы лечым добра.

Разам з тым аднагадовая лятальнасць (суадносіны паміж колькасцю памерлых на першым годзе з моманту ўстаноўленага дыягназу і агульнай колькасцю хворых з такім дыягназам) пры раку малочнай залозы складае 4,6 % (а агульная лічба для ўсіх анкалагічных захворванняў — 21 %).

— Пры выяўленні хваробы на ранняй стадыі жанчына можа быць вылечана з захаваннем органа і добрым касметычным эфектам, — падкрэсліў Сяргей Палякоў.



Сярод прычын, з-за якіх узнікае рак грудзей, **хірург-анколаг, загадчык лабараторыі рэканструкцыйна-аднаўленчай хірургіі і анкамамалогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, кандыдат медыцынскіх навук Антон ХОРАЎ** назваў умовы жыцця, на якія можна паўплываць (харчаванне, гарманальныя змены, колькасць цяжарнасцяў, грудное выкормліванне), а таксама спадчыннасць.

— Сярод найбольш вывучаных прычын — спадчынныя фактары. Такія пухліны, якія звязаны з генетычнымі паломкамі, узнікаюць у ранім узросце і вызначаюцца цяжкім цячэннем, — адзначыў Антон Хораў.

Пры гэтым ён звярнуў увагу, што ўзровень дыягностыкі ў нас можна супаставіць з краінамі-лідарамі ў гэтым кірунку.

— Малекулярна-генетычная лабараторыя, ПЭТ, МРТ, КТ, марфалагічная служба дазваляюць вызначыць асаблівасці пухліны, што ўплывае на выбар тактыкі. На сёння любая лячэбная тактыка не прымяняецца ні да аднаго пацыента ў цэнтры, пакуль цалкам не атрымана інфармацыя пра статус пухліны і яе распаўсюджанасць. І толькі пасля гэтага кансіліум у складзе анколага, хіміятэрапеўта, радыёлага і марфолага прымае рашэнне аб пачатку лячэння. Лячэнне многіх пухлін пачынаецца сёння не з хірургічнай аперацыі, а з так званай лекавай тэрапіі, якая ёй папярэднічае. Гэта дазваляе дасягнуць лепшых вынікаў.

Хірург-анколаг расказаў, што магчымасці хірургічнага лячэння апошнім часам таксама пашырыліся.

— Пры выяўленні на ранніх стадыях мы абмяжоўваемся маленькай аперацыяй, калі ёсць магчымасць захаваць малочную залозу ў поўным аб'ёме. Таксама мы валодаем усім спектрам пластычных, рэканструкцыйных аперацый з выкарыстаннем уласных тканак — перамяшчаючы ласкуты, тлушчавыя камплексы, а таксама выкарыстоўваючы імпланты. Усё гэта садзейнічае хутчэйшай сацыяльнай і псіхалагічнай рэабілітацыі пацыенткі. Яна не губляе прыгажосць і адаптаванасць да жыцця.

### Генетычныя «паломкі» ў беларусак іншыя, чым у расіянак

Спадчынны рак складае каля 10 %. Гэта дэфармацыя ў генах BRSA1 і BRSA2, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне.

— Навошта вызначаць наяўнасць геннай мутацыі для тых, каму ўжо ўстаноўлены дыягназ? Гэта магчымасць скарэктаваць лячэнне. Такім пацыенткам хірургічная аперацыя будзе прапаноўвацца ў пашыраным аб'ёме — з выдаленнем і другой малочнай залозы. Да таго ж такія пухліны маюць адчувальнасць да пэўных хіміяпрэпаратаў, — тлумачыць **загадчык анкалагічнага аддзялення (генетыкі) РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Алена СУБАЧ**. — У нас вялікі вопыт тэсціравання і мы змаглі вывучыць асноўныя мутацыі і паломкі BRSA1 і BRSA2, якія характэрныя для беларускіх жанчын. Яны нават адрозніваюцца ад тых, што пераважаюць у расіянак.

Прычым спадчынныя паломкі ў гэтых генах могуць правакаваць не толькі рак малочнай залозы, але і рак яечнікаў, прастаты і падстраўнікавай залозы.

Магутнасці РНПЦ дазваляюць праводзіць такое генетычнае тэсціраванне (на наяўнасць мутацый у генах BRSA1 і BRSA2) для ўсіх рэгіёнаў краіны. Ведаць свой генетычны статус важна і для сваякоў, каб своечасова папярэдзіць хваробу ці выявіць яе на ранняй стадыі.

### На выжывальнасць уплывае якасць жыцця

Паколькі рак малочнай залозы з'яўляецца самай распаўсюджанай лакалізацыяй у жанчын ва ўсіх развітых краінах, то менавіта гэтага захворвання датычыцца найбольшая колькасць навуковых даследаванняў ва ўсім свеце. Супастаўляльная іх колькасць — хіба што па раку прастаты.

Ён адзначыў, што якасць жыцця ўплывае на аддаленую выжывальнасць анкапацыентак. У дзвюх групах такіх жанчын было праведзена даследаванне. У адной з груп мужчыны пакінулі сям'ю, у другой сем'і захаваліся. Розніца ў выжывальнасці ў гэтых групах адрознівалася на 30 %.

Вядуцца навуковыя пошукі і ў метадах лячэння. У прыватнасці, мяняюцца падыходы да лячэння так званага трыпл-негатыўнага раку, які з'яўляецца самым агрэсіўным відам раку малочнай залозы. Тут выкарыстоўваецца імунатэрапія.



— Вынікі лячэння раку малочнай залозы паляпшаюцца, і са смяротнага захворвання яно паступова пераходзіць у разрад хранічных. Таму акцэнты ў навуковых даследаваннях паступова змяшчаюцца на якасць жыцця, каб яна была не горшай, чым у астатніх жанчын. У прыватнасці, як зменшыць пухліну да такога памеру, каб правесці органазахавальную аперацыю або паставіць імплант, каб захавалася якасць жыцця, — кажа **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Сяргей КРАСНЫ**.

Яе сутнасць у тым, як патлумачыў Сяргей Палякоў, каб разбурыць «сценку» паміж пухлінай і ўласным імунітэтам — і ён пачне распазнаваць і знішчаць шкодныя клеткі. У Беларусі даступная як імунатэрапія, так і некаторыя іншыя новыя метады дыягностыкі і лячэння.

— Таргетныя прэпараты і імунатэрапія ў лекавай тэрапіі, ПЭТ-КТ у дыягностыцы, якое нам вельмі дапамагае, стэрэатаксічнае апрамяненне ў прамянёвай тэрапіі — усё гэта ёсць у нашым цэнтры, нашай краіне і спрыяе таму, што з году ў год паляпшаюцца вынікі лячэння, — рэзюмаваў Сяргей Палякоў.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# СЛЕД НЯБАЧНЫХ КРЫНІЦ

Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА




*Стагоддзі няўмольна мінаюць,*
*Нічога вакол не шкадуюць...*
*Не вер, што крыніцы знікаюць, —*
*Яны у глыбінях вірують.*

*Сваім жыццядайным крананнем*
*Яны наталяюць планету,*
*Знясіленым дораць адхланне*
*І веру ў бясконцасць сусвету.*

*Не спыняць іх камень і спёка,*
*Не сцішыцца ім, не скарыцца...*
*Ты чуеш? Ў глыбінях далёка*
*Спрадвеку віруюць крыніцы.*

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

Гэты невялічкі памятны знак у Мінску на беразе Свіслачы нагадвае пра амаль тысячагадовую даўніну. Пасярод горада з двухмільённым насельніцтвам ён пазначае месца, куды з малітвамі і спадзяваннем прыходзілі нашы далёкія продкі. Тут знаходзілася старажытнае Капішча.

Капішча — сакральнае паганскае месца. У дахрысціянскую эпоху тут было свяцілішча, гарэў ахвярны агонь. З пакалення ў пакаленне пераходзіла традыцыя збірацца каля вялікага каменя «Дзед», набіраць з крыніцы ваду, якая захоўвала ў сабе цудадзейную моц. Згодна з паданнямі, калісьці тут рос велізарны свяшчэнны дуб «Волат». Гэты сакральны комплекс існаваў аж да пачатку XX стагоддзя.

Пра свяшчэнны дуб на гэтым месцы сёння нагадвае стройны малады дубок пасаджаны побач з памятным знакам. Шыльда сведчыць, што ў мінулыя стагоддзі старому дубу «ахвяравалі ручнікі і іншыя тканыя вырабы. Ля ракі бруіла крыніца, вада з якой лічылася святой. Ландшафт і рэчышча ракі Свіслач, дзе размяшчалася свяцілішча, зменены пры будаўніцтве лініі метро. Камень «Дзед» перамешчаны ў музей валуноў пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».



Шмат стагоддзяў пралегла паміж нашым часам і тым, калі з пакалення ў пакаленне да гэтага свяцілішча ішлі нашы далёкія продкі.

Прыходзяць сюды і сёння, каб паглядзець на гэты бераг Свіслачы, палюбавацца маладым дубком, паназіраць за імклівай плынню рэчкі — ці не праб'ецца на паверхню след цудадзейнай крыніцы.

# «МНЕ ХАЦЕЛАСЯ Б, КАБ БЕЛАРУСКАЯ ЛАЗНЯ СТАЛА БРЭНДАМ»



Майстар-клас у Краснадары.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***— Генадзь, давайце пачнём з таго, што за чэмпіянаты такія — па паранні? Навошта яны патрэбныя і чаму ў вас з'явілася ідэя іх праводзіць?***

— Тут я не быў першаадкрывальнікам. Прафесійныя чэмпіянаты па паранні праходзяць у розных краінах. Я ж імкнуўся ўліць у гэты рух свежы струмень і правесці народны чэмпіянат. Мне хацелася паказаць, што беларуская традыцыйная лазня не менш цікавая, чым, напрыклад, шырока вядомая руская. На жаль, многія нашы нацыянальныя традыцыі парання сёння неабходна адраджаць, прафесійных лазеншчыкаў у нас таксама пакуль няшмат. Таму ў 2017 годзе я вырашыў, што чэмпіянаты нашы будуць не прафесійныя, а аматарскія, народныя. Ідэя спадабалася, і на сённяшні дзень у Беларусі праведзены ўжо тры народныя чэмпіянаты. Больш за тое, аматарскія цяпер праводзяцца і ў Расіі, і ў Літве. Падчас такіх мерапрыемстваў з'яўляецца магчымасць даваць майстар-класы людзям, якія цікавяцца традыцыйнай лазняй. Распавядаць пра асаблівасці парання, якія дазваляюць зрабіць лазню спосабам аздараўлення, і пра памылкі, якія наносяць шкоду здароўю. Каб людзі прыходзілі ў лазню не піць спіртное і не гуляць у карты, а менавіта парыцца. І парыцца правільна.

***— Вашы чэмпіянаты збіраюць шмат гледачоў?***

— Так, і з кожным годам іх становіцца больш. Калі ўдзельнікі абараняюць перад журы сваю тэхніку парання, гэта сапраўды цікава — прычым нават тым, хто раней ніколі лазняй не захапляўся. Мы, арганізатары, стараемся зрабіць усё, каб нашы чэмпіянаты праходзілі ярка, цікава і весела. Бо наведванне лазні — гэта зусім не тое ж самае, што звыкла памыцца ў ванне. Гэта своеасаблівае жыццесцвярджальнае свята, якое дае зарад аптымізму і пазітыву. Напрыклад, некалькі гадоў таму мы праводзілі ў Палацы спорту акцыю «Адкрытае акенца жаночай лазні». Мае вучаніцы парылі ўсіх жадаючых — і васямнаццацігадовых дзяўчат, і дам ва ўзросце 40+. Зразумела, усё адбывалася ў купальніках, але астатнія законы правільнай лазні былі вытрыманы і гледачы маглі ўбачыць і б'юціэфект, і амалоджвальнае ўздзеянне паравой лазні. А ў гэтым годзе напярэдадні 8 Сакавіка ў Беларусі адбыўся Міжнародны жаночы конкурс па паранні — сустрэча аматарак заходняга бесконтактнага парання рушнікамі (аўфгус) і традыцыйнага парання венікамі.

## ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

***— Што ж такое сапраўдная беларуская лазня?***

— Гэта не надзвычайная спёка (каля 60°) і разумныя суадносіны тэмпературы і вільготнасці паветра. У гэтым, дарэчы, наша лазня падобная на аўтэнтычную саўну, якую і сёння можна знайсці ў сельскай мясцовасці ў Фінляндыі. Там таксама выкарыстоўваюцца гарачыя камяні, венікі, дровы. Дарэчы, сухая саўна з вельмі высокімі тэмпературамі, якую любяць нашы сучаснікі, не мае ніякага дачынення ні да аўтэнтычнай традыцыі саўны, ні да аздараўлення. Яна з'явілася толькі ў XX стагоддзі, калі былі прыдуманы электранагравальнікі. Сухое распаленае паветра (у сучасных саўнах тэмпературу падымаюць да 120°) — гэта стрэс для арганізма. Я прыхільнік класічнай беларускай лазні, асноўнае правіла якой — сума тэмпературы і вільготнасці не павінна быць большая за 120. Калі тэмпература ў парыльні, дапусцім, 55°, то вільготнасць павінна быць, адпаведна, 65 %. У беларускай лазні ёсць аўтэнтычныя, старажытныя рысы, узрост якіх — напэўна, больш за тысячу гадоў. Гэта, напрыклад, пераважна бярозавыя венікі. Для параўнання, украінцы аддаюць перавагу венікам дубовым: у іх гістарычна склалася ўдарная тэхніка, а ў нас падчас парання больш выкарыстоўваліся масажныя рухі.

***— Вы толькі вывучаеце і захоўваеце старадаўнія традыцыі парання, або беларуская лазня развіваецца і сёння?***

— Ну зразумела, развіваецца, бо гэта не музейны экспанат, а жывая з'ява. Мы, прафесійныя лазеншчыкі, пастаянна абменьваемся вопытам. Сёе-тое з беларускіх лазневых традыцый, да прыкладу, прыжылося ў Татарстане, а некаторыя асаблівасці я ўзяў для сябе ў расійскіх майстроў пары. Ну, і самі мы пастаянна распрацоўваем нешта новае. Напрыклад, выкарыстоўваем пры паранні стоўн-тэрапію, а таксама розныя масажныя тэхнікі. У прыватнасці, масаж выконваецца заваранымі ў кіпені мяшэчкамі з натуральнай ільняной тканіны, якія мы напаўняем гаючымі травамі ў залежнасці ад сезона і патрэб госця. Свайго роду «наш варыянт SPA».

***— Раскажыце аб вашай аўтарскай праграме «Пар Мароза» — у яе ёсць аматары?***

— Сутнасць маёй методыкі — кантраст: чым мацней награваецца арганізм, тым мацней яго трэба астудзіць. Пар і высокая тэмпература прымушаюць пашырацца капіляры на 30 % больш крыві, чым звычайна, чалавек пацее, з арганізма выводзяцца таксіны. Рэзкае ахаладжэнне прыводзіць да сціскання капіляраў, сасудзістая сістэма вызваляецца ад халестэрынавых бляшак, дасягаецца магутны ачышчальны эфект. Яшчэ адна асаблівасць — вялікая колькасць вады на аднаго чалавека (50 і больш літраў на праграму): вада змывае і фізічнае недамаганне, і псіхалагічныя праблемы. У маёй праграмы дастаткова аматараў у розных краінах свету. Ёсць кліенты з ЗША, Аўстраліі, Кубы, Еўрапейскіх краін. Мне хацелася б, каб беларуская лазня стала брэндам. Яна гэтага вартая — і гэта не толькі маё меркаванне. На міжнародных чэмпіянатах я часта пазнаю ў выступленнях многіх удзельнікаў свае методыкі работы венікам і нашы нацыянальныя тэхналогіі парання, якія я дэманстраваў раней. Але ж з-за мяжы кліенты едуць не ў лазню наогул, а да канкрэтнага майстра з рэпутацыяй. Хацелася б, каб майстроў у Беларусі было шмат, гэта дазволіць нашай традыцыі парання стварыць свой імідж — як, напрыклад, у той жа японскай лазні афура або ў турэцкага хамама.

## ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

***— Калі лазня такая карысная, чаму ж у яе ёсць перакананыя праціўнікі? І акрамя таго, паранне мае вельмі шмат супрацьпаказанняў...***

— Сапраўды, у многіх гараджан за плячыма няўдалы вопыт наведвання паравой лазні. Непрафесійныя лазеншчыкі выклікалі ў іх негатыўныя эмоцыі, і цяпер перакананы ў тым, што гэта вельмі сумна. Ну, а супрацьпаказанняў у беларускай лазні з прафесійным парыльшчыкам усяго некалькі: першыя тры месяцы цяжарнасці, скурныя хваробы, хранічныя хваробы ў перыяд абвастрэння, вострыя запаленчыя захворванні (з «ковідам» у лазню ісці нельга!), рак. Але падкрэслю: з прафесійным лазеншчыкам. Прафесіянал — гэта той, хто ведае, як трэба парыць госця менавіта ў дадзены момант, прымаючы пад увагу яго фізічны і псіхалагічны стан, здароўе, настрой. У лазні, як нідзе, важны індывідуальны падыход.

***— А як становяцца прафесійнымі лазеншчыкамі?***

— Гэта доўгі шлях. Каб стаць прафесіяналам, я вучыўся ў майстроў у Расіі, Украіне, краінах Балтыі, збіраў па крупінках веды аб нашай нацыянальнай лазні па ўсёй Беларусі. Прафесіянал павінен прайсці навучанне ў лазневых школах, дзе даюць сур'ёзныя веды, — яны ёсць ва Украіне, Санкт-Пецярбургу, у Казані, на Урале. Ёсць мая школа ў Мінску. Прафесіянал абавязаны валодаць дзясяткамі методык парання, ведаць, як не нашкодзіць госцю пры наведванні парыльні. Калі да лазеншчыка прыходзяць як да ўрача — з тым жа даверам з боку госця і з той жа мерай адказнасці з боку прафесійнага парыльшчыка — тады паранне прынясе толькі карысць. Сярод маіх гасцей былі цяжарныя жанчыны на вялікіх тэрмінах. А адзін мой калега пачаў парыць свайго сына, калі таму не было яшчэ і двух тыдняў.



Самы юны госць.
Узрост лазні не перашкода.

## У ЛАЗНЮ ЗА МАЛАДОСЦЮ

***— Пагаворым пра б'юці-эфект класічнай паравой лазні: ён сапраўды ёсць?***

— Перакананы: айчынная лазня лепш за замежныя SPA захоўвае маладосць і прыгажосць нашых жанчын, таму што яна створана для тых кліматычных умоў, у якіх мы жывём. Эфект скрабіравання забяспечвае, напрыклад, лыкавае мачала, якое адвеку выкарыстоўвалі нашы продкі. А вось сінтэтычнымі мачалкамі ў лазні я карыстацца не раю, як і гелямі для душа. Травы выдатна мыюць, гэта натуральна і карысна для скуры. Паравая лазня — гэта і водатэрапія (вядома, калі вы карыстаецеся правільнымі венікамі). Ліпавыя я нарыхтоўваю, калі ліпа квітнее. Узімку асабліва карысны ядлоўцавы венік. Ну, а бярозавыя венікі лепш за ўсё вязаць, калі з'яўляюцца маладыя лісцікі. Гэта эфектыўны сродак барацьбы з запаленнямі скуры плюс магутны зарад вітамінаў.

***— SPA асацыюецца з абкручваннямі — ці магчымыя такія працэдуры ў парыльцы?***

— Пры высокай тэмпературы не трэба дадатковага ўцяплення, можна проста наносіць маскі на цела і атрымліваць той жа эфект. Напрыклад, вельмі эфектыўная маска з блакітнай гліны. Гэтая гліна ёсць не толькі на Усходзе, але і ў Беларусі, у Магілёўскай вобласці. Выдатна працуе антыцэлюлітны мядовы масаж. Эфект anti-age дасягаецца спалучэннем цяпла і холаду: гэта адзін з прынцыпаў прыгажосці яшчэ з антычнасці. Калі наведваць правільную парылку раз у 10 дзён, узроставыя змены скуры «адсунуцца» гадоў на 7-8, маршчынкі разгладзяцца, авал твару падцягнецца. А вось чакаць эфекту пахудзення ад лазні я не рэкамендаваў бы. Зразумела, калі не папаўняць страту вадкасці ў парыльні, за 60 хвілін можна згубіць больш за 1,5 кг вагі. Але дасягаецца гэта за кошт абязводжвання — а значыць, не карысна і не даўгавечна. Лазня дапамагае пахудзець, але не наўпрост: яна паскарае абмен рэчываў, нармалізуе ліпідны абмен і падтрымлівае імунітэт.

***— Лічыцца, што паранне — добры спосаб барацьбы са стрэсам. Ці так гэта?***

— Дакладна. Больш за тое — лазня дае эфект «быццам другі раз нарадзіўся»: супакойвае нервы і парадкуе думкі. Правільная лазня «змывае» негатыў, агрэсію, незадаволенасць жыццём. Застаюцца толькі пазітыўны настрой і адчуванне напоўненасці новымі сіламі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# БУКЕТЫ РЭПІНСКАГА ДОМА

## У гэтым маёнтку гулялі ў любімую гульню мастака — кракет



**Недалёка ад Віцебска ў музеі-сядзібе І. Я. Рэпіна «Здраўнёва» (філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея) арганізавалі інтэрактыўнае свята «Восеньскі букет». Сёлета 90 гадоў з даты смерці генія: ён пайшоў з жыцця 29 верасня 1930 года, гэта здарылася прыкладна за сорак кіламетраў ад Санкт-Пецярбурга (памёр у сваёй тамтэйшай сядзібе Пенаты). Культурная падзея стала добрай магчымасцю ўспомніць яго жыццё, стаць бліжэй да творчай спадчыны мастака.**

Упершыню падчас мерапрыемства можна было ўбачыць «выстаўку аднаго дня» — карціну «Ісус з чашай» (з фондаў абласнога музея). Яна была напісана для Слабадской царквы, што знаходзілася непадалёк, і на могілках каля якой быў пахаваны бацька мастака. Акцыя «Восеньскі букет» стала сюрпрызам для шматлікіх аматараў творчасці Рэпіна, турыстаў, якія прыехалі здалёк у сядзібу ў гэты дзень. Імпрэза, так бы мовіць, закрыла летні музейны сезон. Але ж, безумоўна, «лецішча» славутага мастака адкрыта для наведвальнікаў круглы год.

У багатай праграме былі майстар-клас па стварэнні букетаў, карцін з кветак, турнір па гульні ў кракет — апошні вельмі падабаўся мастаку. Арганізавалі і мінікірмаш рамеснікаў, распродаж выпечкі, і там увесь час стаялі чэргі. У «Арт-зонах» малявалі партрэты і шаржы... Вельмі спадабалася наведвальнікам сядзібы экскурсія ў склеп рэпінскага перыяду. На жаль, гэта адзінае збудаванне дарэвалюцыйнага часу. Народ добра рэагаваў на прапанову пакаштаваць «рэпінскай самагонкі» і закусіць салам з агуркамі... Нават жанчыны, якія самі займаюцца вырабам саленняў, прызнаваліся, што такіх смачных агуркоў даўно не елі.

Пра тое, якой была рэпінская гаспадарка, распавядаў гасцям **краязнавец Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея па навуковай рабоце.**

Пад Віцебскам у цёплую пару года Рэпін пачаў адпачываць пасля таго, як імператар Аляксандр III набыў за 35 тысяч рублёў яго карціну «Запарожцы». На беразе Заходняй Дзвіны ў 1892 годзе мастак купіў маёнтак у адзінокай жанчыны Софіі Яцкевіч. Яе сям'я валодала ім з 1836 года. А наогул, сядзіба пад рознымі назвамі вядомая па дакументах з 1785-га. Тут Рэпін напісаў палотны «Беларус», «Асенні букет», «На сонцы», «Дуэль», «Месячная ноч» і іншыя.

— Ілья Яфімавіч аддаў шмат сіл добраўпарадкаванню Здраўнёва. З грэбня рачной тэрасы адкрываліся цудоўныя перспектывы на парослы лесам супрацьлеглы бераг, палі і аддаленыя паселішчы. Але трохі парушыў гармонію шэраг гаспадарчых пабудоў. У цэнтры сядзібы знаходзіўся гаспадарчы двор са свірнам, домам для рабочых і флігелем... На беразе ўніз па цячэнні ракі забудову завяршалі хлявы, адрыны, двор для жывёлы і малацільны ток. Каб палепшыць гэтую пярэстую карціну, Рэпін высаджвае елкі на выездзе на бальшак. А вакол саду — палосы з ельніку, бярозы, ляшчыны. З лагчыны зрабілі сажалку.



У садзе разбілі ліпавую алею. Уладкоўваецца пляцоўка для гульні ў кракет. Насупраць вокнаў майстэрні насыпалі горку для пазіравання. І мастак з гумарам назваў яе «Манблан». Яшчэ была дзярновая лаўка ў выглядзе амаль замкнутай акружнасці. Яе за падабенства да кратара вулкана мастак празваў Везувіем, — расказаў супрацоўнік музея.

Апошні раз Рэпін гасцяваў пад Віцебскам у 1904 годзе.

Дзіўна, што ў адрозненне ад іншых сядзіб гэтую не разрабавалі. А ўсё таму, што сяляне вельмі паважалі мастака і яго сям'ю. Рэпін і яго блізкія клапаціліся аб тым, каб простыя людзі жылі годна, дапамагалі ім у цяжкія гадзіны... Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Здраўнёве жыла сям'я малодшай дачкі мастака. У жніўні 1930-га родныя Рэпіна з'ехалі ў Пенаты, а састарэлы дом быў прададзены на дровы...

Здраўнёва дзесяцігоддзямі чакала аднаўлення. І работы на тэрыторыі рэпінскай сядзібы распачалі яшчэ ў савецкі час. А дакладней, у другой палове 1980-х. Музей быў створаны ў 1988-м. Але цяжкі лёс бывае і ў будынкаў, не толькі ў людзей. У 1995-м дом згарэў. Праз пяцігодку тут зноў пабывалі першыя наведвальнікі.

Цяпер у музеі кожны год дзясяткі тысяч турыстаў. Тут праводзяць круглыя сталы, семінары, пленэры. У сядзібы такая класная энергетыка, што падчас яе наведвання аднаўляюцца сілы, творчыя людзі натхняюцца новымі ідэямі. Безумоўна, «Здраўнёва» — адна з сапраўдных турыстычных жамчужын Беларусі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Спорт

# МІНСК ПРЫМАЕ МІЖНАРОДНЫ НАВУКОВЫ КАНГРЭС

**У Нацыянальным алімпійскім камітэце стартаваў XXV Міжнародны навуковы кангрэс «Алімпійскі спорт і спорт для ўсіх». Ён стане выдатнай пляцоўкай для вырашэння актуальных пытанняў алімпійскага руху і адкрытага абмеркавання праблем. Свае намаганні для гэтага аб'яднае больш за 200 спецыялістаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Кітая, Казахстана, Японіі, Узбекістана, Малдовы, Польшчы, Аўстраліі і іншых краін.**

«Апошні раз кангрэс праходзіў у Беларусі 12 гадоў таму. Пасля шэрагу семінараў, пасля таго, як увесь свет убачыў Еўрапейскія гульні ў Мінску, нам прапанавалі зноў прыняць гэта мерапрыемства. Кангрэс «Алімпійскі спорт і спорт для ўсіх» — выдатная пляцоўка для абмену вопытам паміж спартыўнымі прафесіяналамі з розных краін. Тут мы можам абмеркаваць важныя праблемы алімпійскага руху і перспектывы яго развіцця. Сёння ва ўмовах пандэміі спартыўныя мерапрыемствы праводзяцца ў няпростых умовах і кожная краіна робіць гэта па-свойму. І ўсім карысна абмяняцца вопытам, каб рухацца далей. Жыццё не спыняецца, наперадзе Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету па розных відах спорту», — адзначыў **міністр спорту і турызму Беларусі Сяргей КАВАЛЬЧУК.**

У праграму кангрэса ўключаны дыскусіі, майстар-класы, прадстаўленне праектаў ад тэарэтыкаў і практыкаў. Удзельнікі абмяркуюць падрыхтоўку спартсменаў ва ўмовах пандэміі, прымяненне сучасных тэхналогій, спартыўную медыцыну, барацьбу з допінгам і іншыя важныя спартыўныя пытанні. Сярод такіх пытанняў і папулярызацыя здаровага спосабу жыцця, і арганізацыя спорту для ўсіх.

«Дазвольце выказаць сваю ўдзячнасць кіраўніцтву краіны і арганізатарам за магчымасць правесці кангрэс. Сёлета ён праходзіць у вельмі незвычайных умовах і таму мае асаблівую значнасць. Такім чынам мы дэманструем салідарнасць і адзінства, жаданне працягваць абменьвацца навуковым вопытам. Рэспубліка Беларусь паказвае сур'ёзны дзяржаўны падыход да арганізацыі навуковых даследаванняў, алімпійскага руху і ўніверсітэцкай супольнасці. Сімвалічна, што зараз мы знаходзімся ў зале алімпійскай славы. Сёння алімпійскі рух як ніколі мае патрэбу ў прафесійным падыходзе. Спорт — гэта самы моцны інструмент аб'яднання, асабліва ў перыяд пандэміі. І спадзяюся, што кангрэс гэта пацвердзіць», — адзначыў у сваім прывітальным слове **Алег МАТЫЦЫН, міністр спорту Расійскай Федэрацыі.**

Асаблівую ўвагу ўдзельнікі кангрэса аддадуць студэнцкаму спорту і алімпійскай адукацыі. Гэтым тэмам будуць прысвечаны многія секцыі і семінары. У межах кангрэса пройдзе навукова-адукацыйны батл «Рэаліі і перспектывы развіцця алімпійскага спорту і алімпійскай адукацыі ў свеце», дзе будуць прадстаўлены новыя віды спорту і падыходы ў іх арганізацыі. Такі інтарэс да падрыхтоўкі спартыўных кадраў выкліканы тым, што адзін з ініцыятараў кангрэса — Міжнародная асацыяцыя ўніверсітэтаў фізічнай культуры і спорту.

У першы дзень кангрэса быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні паміж Беларускай асацыяцыяй студэнцкага спорту і Расійскім студэнцкім спартыўным саюзам. Гэты дакумент замацуе спартыўныя сувязі дзвюх краін для плённага развіцця двухбаковага абмену ў сферы студэнцкага спорту.

Міжнародны навуковы кангрэс «Алімпійскі спорт і спорт для ўсіх» скончыцца 17 кастрычніка. Ён задасць асноўныя вектары навуковага і практычнага развіцця сучаснага спорту.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Прырода і мы

# Навошта тчэцца «Ізумрудная сетка»?

**Захаваць і рэдкія, і наогул усе віды жывёл і раслін магчыма толькі разам з тым натуральным асяроддзем, якое з'яўляецца іх «домам». Таму ахове ландшафтаў і экасістэм у нашай краіне аддаецца дзяржаўны прыярытэт.**

У 2013 годзе наша краіна далучылася да Бернскай канвенцыі «Аб ахове дзікай фаўны і флоры і прыродных асяроддзяў пражывання ў Еўропе». З яе дапамогай сумесна вырашаюцца праблемы ратавання відаў, асабліва тых жывёл, якія мігрыруюць трансгранічнымі шляхамі. Створана «Ізумрудная сетка», у якую ўвайшлі асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі; тэрыторыі, якія падлягаюць спецыяльнай ахове (напрыклад, біятопы, дзе зарэгістраваны чырванакніжныя віды), а таксама тыя, якія пакуль не маюць ахоўнага статусу, але адпавядаюць крытэрыям Бернскай канвенцыі. Як паведаміў **кансультант упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віталь КАРАНЧУК,** у Беларусі цяпер налічваецца 155 аб'ектаў «Ізумруднай сеткі». Іх агульная плошча складае 2,3 млн га, ці 11,1 % тэрыторыі краіны. Плануецца, што, калі фарміраванне яе будзе завершана, гэты паказчык дасягне 13-15 %.

Наша дзяржава на заканадаўчым узроўні рэалізуе патрабаванні Бернскай канвенцыі. У мэтах захавання натуральных экалагічных сістэм, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, а таксама забеспячэння належнага асяроддзя пражывання дзікіх відаў прыняты Указ № 108 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб экалагічнай сетцы». Яе «ядры» — міграцыйныя калідоры жывёл уздоўж рэк, пункты, дзе птушкі масава спыняюцца для адпачынку ці гнездавання.

Адзін з самых важных участкаў «Ізумруднай сеткі» — Палессе з яго ўнікальнай прыродай. Але экалагі занепакоены праектам будаўніцтва воднага шляху Е-40, дзеля якога спатрэбілася б выраўноўваць і паглыбляць рэчышча Прыпяці. **Дырэктар грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ** перакананы, што гэта прывядзе да страты многіх тэрыторый з міжнародным ахоўным статусам. Толькі прыярытэтнае рашэнне экалагічных праблем будзе спрыяць і эфектыўнай эканоміцы, і захаванню здароўя людзей.

Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах праводзіць мерапрыемствы для аднаўлення парушаных тарфянікаў, падтрымкі экасістэм нізінных балот у натуральным стане, удзельнічае ў міжнародных прыродаахоўных праектах.

Пад патранажам Міністэрства лясной гаспадаркі паспяхова вядзецца аднаўленне папуляцыі буйных траваедных. **Начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Мінлясгаса Аляксандр КАЗАРЭЗ** засведчыў: «Цягам апошніх пяці гадоў у дзікую прыроду засялена больш за пяць тысяч высакародных аленяў. Цяпер іх у нашых лясах 30 тысяч асобін. У мінулым годзе лясной службай Нідэрландаў перадала ў заказнік «Налібоцкі» 150 тарпанападобных коней. Яны гарманічна ўпісаліся ў тутэйшую экасістэму, і сёлета на свет з'явілася каля 40 жарабят. Дзікія коні пасвяцца на адкрытых мясцінах і не даюць тым зарастаць. У выніку туды вяртаюцца на гнездаванне птушкі».

У заказніку «Налібоцкі» створаны пітомнік заходнееўрапейскага падвіду глушца, які знаходзіцца на мяжы знікнення. Другі год запар тут выводзяцца птушаняты. Сёлета маладняк будуць выпускаць на волю ў адным з лясгасаў на тэрыторыі Налібоцкай пушчы. Дарэчы, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях паляванне на глушцоў забаронена.

Пасля высечак абавязкова аднаўляюцца лясы. Рэкорд, дасягнуты за апошнія 70 гадоў, — лясамі пакрыта 40 % тэрыторыі краіны. У 1940-я гады гэты паказчык быў амаль удвая меншы.

— Новы, больш строгі і дзейсны механізм аховы біятопаў — іх пашпартызацыя і перадача пад адказнасць землекарыстальнікам. Гэта прагрэсіўны шлях, які фарміруе экалагічна арыентаваных гаспадароў, забяспечвае іх узаемадзеянне з органамі ўлады, — падкрэсліў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Дзмітрый ГРУМО.** Ён лічыць неабходным распрацаваць нацыянальны ілюстраваны каталог біятопаў, які паслужыў бы даведнікам для ўсіх зацікаўленых асоб.

**Святлана ІШЧАНКА.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

16 кастрычніка 2020 г. № 39 (575)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


З НАГОДЫ

# ЛЮБІЦЬ СЯМ'Ю, РАДЗІМУ, МЕСЦА, ДЗЕ ЖЫВЕШ...

## Сенатары павіншавалі жанчын у радзільні з Днём маці

**Дзяржавай створаны ўсе ўмовы, каб у беларускіх сем'ях нараджаліся жаданыя дзеці, заявіў журналістам старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Віктар ЛІСКОВІЧ падчас візіту з кіраўнікамі горада Мінска ў радзільню 5-й гарадской клінічнай бальніцы. Там яны адкрылі скульптурную кампазіцыю «Маці і дзецям» і павіншавалі жанчын са святам.**





— Сёння ў Беларусі налічваецца больш за 110 тысяч шматдзетных сем'яў. У іх выхоўваюцца каля 360 тысяч дзяцей. За апошнія 10 гадоў колькасць шматдзетных упэўнена расце, — сказаў Віктар Лісковіч. — Дзяржава нацэлена на тое, каб беларускія сем'і былі моцныя і шчаслівыя, каб у іх нараджаліся жаданыя дзеці.

Па словах сенатара, у Беларусі прадугледжаны і механізмы матэрыяльнага стымулявання. З 1 студзеня 2021 года перыяды дэкрэтнага водпуску будуць залічвацца ў агульны стаж работы ў межах 12 гадоў, а не 9 гадоў, як цяпер. У той жа час пры нараджэнні чацвёртага дзіцяці страхавы стаж зменшыцца з 17,5 да 10 гадоў. Гэта два значныя моманты, якія ў наступным будуць рэгуляваць пытанні пенсійнага забеспячэння жанчын. Яшчэ адна вялікая падтрымка — сямейны капітал.

стар. 2

РЭЙД

# Бяспека як трэнд жыцця на вёсцы

**На пачатку ацяпляльнага сезона спраўнасць электраправодкі і пячнога ацяплення ў жылых дамах — на асаблівым кантролі ўдзельнікаў назіральных камісій. У Гомельскім раёне першы прафілактычны рэйд правялі па тэрыторыі Прыбарскага сельсавета.**

У шасці населеных пунктах пражывае амаль дзве тысячы чалавек. Каля шасцісот дамоў у мясцовых вёсках — з пячным ацяпленнем. Такія домаўладанні, вядома, на асаблівым кантролі назіральнай камісіі. У яе складзе — кіраўніцтва Прыбарскага сельвыканкама, інспектар раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, супрацоўнікі «Гомельаблгаза» і «Энерганагляду», участковы інспектар міліцыі, а таксама сацыяльны і медыцынскі работнік.

Рэйд правялі перш за ўсё па домаўладаннях аграгарадка Прыбар. Галоўная задача — ацаніць стан пячнога, газавага абсталявання, спраўнасць дымаходаў і электраправодкі ў дамах, дзе пражываюць шматдзетныя сем'і, адзінокія пажылыя людзі, інваліды.

стар. 4



ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Падтрымка экспарту

**Механізмы падтрымкі экспарту сумеснай беларуска-расійскай прадукцыі на рынкі трэціх краін абмеркавалі падчас рабочай сустрэчы ў Савеце Рэспублікі. Яна была прымеркавана да сумеснага пасяджэння камісій па бюджэце і фінансах і эканамічнай палітыцы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, якое запланавана на лістапад.**

У ходзе сустрэчы старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец адзначыла, што на нацыянальных узроўнях рэалізуюцца адпаведныя праграмныя дакументы па падтрымцы і дыверсіфікацыі экспарту. Вытворцы нашых краін знаходзяцца ў пошуку рашэнняў па фінансаванні экспарту сумесна выпрабленай прадукцыі, таму беларускія і расійскія парламентарыі не могуць застацца ўбаку ад гэтых пытанняў. У прыватнасці, адным з цікавых пілотных праектаў з'яўляецца крэдытаванне экспарту ў трэція краіны кар'ерных самазвалаў вытворчасці «БелАЗа».

Аб рашэннях па развіцці экспарту сумеснай беларуска-расійскай прадукцыі ў трэція краіны, прынятых падчас пашыранага пасяджэння нацыянальных дзелавых саветаў у рамках Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, паведаміў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч.

## Дыялог як варыянт

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, першы прарэктар Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Алег РАМАНАЎ узначаліў дыялогавую пляцоўку «Канстытуцыйнае рэфармаванне і партыйнае будаўніцтва». Мэты дыялогу — абмеркаванне канстытуцыйнай рэформы і іншых заканадаўчых актаў для павышэння эфектыўнасці дзяржаўнага, эканамічнага, сацыяльна-культурнага будаўніцтва.**

Паводле слоў сенатара, пляцоўкай для тэматычнага блока «Канстытуцыйнае рэфармаванне і партыйнае будаўніцтва» стане Гродзенскі ўніверсітэт. У рамках дыскусій змогуць выступаць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, прафесійных і бізнес-супольнасцяў, дэпутаты, лідары і актывісты грамадскіх арганізацый і палітычных партый, іншых грамадзянскіх ініцыятываў, моладзь і людзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, у якіх ёсць канструктыўныя прапановы па змяненні дзеючага заканадаўства.

## У чаканні новай зоркі

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, начальнік Гомельскай мытні Фелікс ЯШКОЎ прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця Алімпійскіх дзён моладзі і першынства Гомельскай вобласці па цяжкай атлетыцы сярод юнакоў і дзяўчат.**

Турнір традыцыйна праводзіцца ў спартыўным комплексе «Гомсельмаша», дзе вядзецца актыўная работа па папулярызацыі здаровага спосабу жыцця, фізкультуры і спорту сярод насельніцтва ўсіх узроставых катэгорый. Створаны і функцыянуюць спартыўныя аб'екты для заняткаў лёгкай атлетыкай, плаваннем, футболам і многімі іншымі відамі спорту.

У сваім выступленні сенатар падзякаваў калектывам спартыўнай школы і «Гомсельмаша» за асаблівую ўвагу да развіцця цяжкай атлетыкі. Паводле яго слоў, спартсмены займаюцца тут у камфортных умовах, у залах, абсталяваных усім неабходным для трэніровак. Акрамя таго, пры садзейнічанні абласнога аддзялення Беларускага цяжкаатлетычнага саюза было набыта абсталяванне, якое дазваляе праводзіць спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы самага высокага ўзроўню.

На думку Фелікса Яшкова, сёння на гэтых спаборніцтвах, мы, магчыма, убачым нараджэнне новай зоркі цяжкай атлетыкі, як гэта было ўжо неаднойчы.

СУСТРЭЧЫ

## Асаблівасці выхаваўчай работы ў няпросты перыяд

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ наведалі вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны.**

Віктар Лісковіч сустрэўся з рэктарам БДУ Андрэем Каралём, з якім былі грунтоўна абмеркаваны актуальныя пытанні арганізацыі навучальнага працэсу, асаблівасці выхаваўчай работы на сучасным этапе ва ўніверсітэце, які з'яўляецца вядучай навучальнай установай краіны, а таксама шляхі фарміравання маладзёжнай палітыкі і іншыя злабадзённыя пытанні, якія хвалююць студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкі калектыў, паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі.

Сяргей Рачкоў наведаў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, дзе сустрэўся са студэнцкім актывам. Падчас сустрэчы сенатар падрабязна расказаў аб дзейнасці верхняй палаты парламента, прынятых сенатарамі законапраектах, іх арыентаванасці на паляпшэнне якасці жыцця людзей.

Асобнай тэмай гутаркі стала грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі пасля электаральнай кампаніі, прымаемыя меры па яе стабілізацыі. Былі абмеркаваны асноўныя этапы сцэнарыя «каляровай рэвалюцыі», рэалізацыя якой сарваная дзякуючы скаардынаваным дзеянням дзяржаўных інстытутаў. «Беларусь — міралюбівая краіна. На нас аказваецца беспрэцэдэнтны знешні ціск, які стварае пратэсную турбулентнасць у краіне. Унутраная стабільнасць і спакой з'яўляюцца гарантыяй захавання Беларусі як незалежнай суверэннай дзяржавы. Наша будучыня залежыць толькі ад нас саміх», — паведаміў у размове са студэнтамі старшыня Пастаяннай камісіі.

Ён дэталёва расказаў пра значныя негатыўныя наступствы «каляровай рэвалюцыі» ў Егіпце, дзе працаваў у той перыяд паслом Беларусі. «Дзяржаўныя перавароты заўсёды заканчваюцца сур'ёзнымі стратамі для краіны ў эканамічным і сацыяльным развіцці, гінуць нявінныя людзі, якімі бязлітасна маніпулююць, сур'ёзна пакутуе міжнародны аўтарытэт дзяржавы. Краіна адкідваецца на дзесяцігоддзі назад. Патрабуюцца многія гады і сур'ёзныя рэсурсы для аднаўлення страчанага», — канстатаваў сенатар.

Сяргей Рачкоў звярнуў увагу студэнтаў на адкрыццё дыялогавых пляцовак па абмеркаванні канстытуцыйнай рэформы, маладзёжнай палітыкі, пытанняў эканомікі і бізнесу, сацыяльнай палітыкі, рэгіянальнага развіцця, адукацыі. «Улада ўвесь час вядзе дыялог з насельніцтвам, выкарыстоўваючы розныя каналы і фарматы, у тым ліку асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы ў працоўных калектывах, праз сродкі масавай інфармацыі. Дыялогавыя пляцоўкі накіраваныя на актывізацыю зносін з грамадствам з мэтай абмеркавання шляхоў развіцця краіны на найбліжэйшую перспектыву, якія плануецца разгледзець падчас Усебеларускага народнага сходу», — адзначыў сенатар Сяргей Рачкоў.

Ён адказаў на пытанні студэнтаў, якія датычыліся рэакцыі замежных дзяржаў і СМІ на падзеі, што адбываюцца ў Беларусі. Ён таксама закрануў тэму ўплыву пандэміі і сусветнага эканамічнага крызісу на эканоміку Беларусі і перспектывы яе развіцця. Размова ішла і аб магчымых метадах і шляхах стрымлівання міграцыі беларускай моладзі за мяжу.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ЛЮБІЦЬ СЯМ'Ю, РАДЗІМУ, МЕСЦА, ДЗЕ ЖЫВЕШ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

— На сённяшні дзень сямейным капіталам скарысталася амаль 90 тысяч сем'яў. У цэлым прызначаны капітал на суму практычна 850 мільёнаў долараў, — адзначыў сенатар. — Створаны ўсе неабходныя ўмовы для дашкольнага выхавання. Будуюцца дзіцячыя садкі ў крокавай даступнасці. Толькі ў 2019 годзе іх адкрыта 15. Узводзяцца сучасныя школы з басейнамі і трэнажорнымі заламі. Усё гэта дае магчымасць дзецям гарманічна развівацца.

Віктар Лісковіч падкрэсліў, што самае галоўнае, каб дзіця расло ў дружалюбнай сям'і.

— З самага дзяцінства мы павінны выхаваць дзяцей такімі, каб яны любілі сваю сям'ю, Радзіму, месца, дзе жывуць. Трэба прывіваць ім якасці, неабходныя для жыцця, — дадаў ён.

Жанчыны, якіх прыехалі павіншаваць высокія госці, атрымалі падарункі: кветкі, наборы для немаўлят. Сімвалічнае ў той дзень было і адкрыццё манумента, прысвечанага мацярынству, каля ўвахода ў радзільны дом. Па ініцыятыве **галоўнага ўрача бальніцы Міхаіла НАЗАРЧУКА** на натуральным камені скульптарам Аляксандрам Шомавым быў створаны бронзавы манумент. Ідэя нарадзілася адразу пасля адкрыцця новага корпуса радзільнага дома, якому ў снежні споўніцца пяць гадоў.

«Мы даўно выношвалі гэту ідэю і сёння, нарэшце, увасобілі яе ў жыццё. Скульптура прысвечана ўсім нашым маці і дзецям, няхай яна прыносіць поспех і дабрабыт», — сказаў Міхаіл Назарчук. Удзел у цырымоніі адкрыцця скульптуры прынялі сенатары і кіраўнікі сталічнай адміністрацыі. Госці павіншавалі





жанчын, якія нарадзілі ў Дзень маці, а таксама шматдзетных маці, чые сем'і на днях таксама папоўніліся немаўляткамі. Па словах галоўнага ўрача, у Дзень маці першы малы з'явіўся на свет у 1.48. Гэта быў хлопчык. Усе мамы ў святочны дзень адчувалі сябе добра, у іх прыўзняты настрой.

«У мяне нарадзілася чацвёртае дзіця, сын Савелій, — сказала Таццяна Гонтарава. — У гэтым радзільным доме нарадзіла другі раз, вельмі хацела сюды патрапіць. Тут новыя палаты, вельмі добрыя камфортныя ўмовы. А перадродавая палата наогул шыкоўная — усё на месцы, нікуды не трэба бегаць».

Таццяну падтрымала і суседка па палаце, студэнтка Вольга Аскер. Тут прайшлі яе першыя роды. Маладая мама лічыць, што ў радзільным доме вельмі ўважлівы персанал.

«Я нараджала ўпершыню, — прызналася Вольга. — І вельмі перажывала, хацелася, каб мая дачка Алівія нарадзілася ў добразычлівай атмасферы. Так і выйшла. Алівія з'явілася на свет у цудоўны дзень, а побач былі прафесіяналы. Вельмі прыемна, што нас віншуюць не толькі родныя, але і прадстаўнікі дзяржавы».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ

## Сітуацыя з цэнамі, або Размова на актуальную тэму

**Учора ў рэжыме відэаканферэнцыі адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, на якім разгляdaліся асаблівасці бягучай цэнавай сітуацыі ў краіне. На сувязі былі многія рэгіёны Беларусі.**




Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— Цэны — тая тэма, якая хвалюе насельніцтва больш за ўсё, самая актуальная. Калі яны будуць высокія, то зарплаты заўсёды будзе не хапаць. Таму гэтай тэме аддаецца велізарная ўвага ў нашай краіне, яна знаходзіцца на пастаянным кантролі ў Прэзідэнта і ўрада, — адзначыла ў размове з журналістамі **старшыня камісіі Таццяна РУНЕЦ.**

Як вынікае з яе слоў, роля Савета Рэспублікі і яго членаў у маніторынгу цэн на сацыяльна значныя тавары ва ўсіх рэгіёнах будзе ўзрастаць. Сенатары на мінулым тыдні пачалі ўжо адсочваць на сваіх тэрыторыях сітуацыю з цэнамі па асноўных групах спажывецкіх тавараў. Першыя назіранні і папярэднія высновы сведчаць, што моцнага скачка не зафіксавана, цэны знаходзяцца ў межах інфляцыі.

Надалей маніторынг у рэгіёнах працягнецца. З гэтай мэтай сенатары будуць актыўна карыстацца статыстыкай Нацстата, данымі прафсаюзаў, Дзяржкантролю, органаў дзяржаўнага кіравання, іншымі крыніцамі дакладнай і свежай інфармацыі. Вынікі будуць штомесяц аналізавацца.

У выпадку выяўлення якіх-небудзь негатыўных тэндэнцый, насцярожваючых фактаў, скаргаў і зваротаў ад выбаршчыкаў і пакупнікоў сенатары будуць аператыўна рэагаваць на іх, своечасова інфармаваць для прыняцця мер адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання.

Крыху раней, 9 кастрычніка, Таццяна Рунец прыняла ўдзел у рабоце Экспертнага савета па пытаннях цэн і тарыфаў. Гэта важная пляцоўка для маніторынгу цэнавай сітуацыі ў краіне, паглыбленага аналізу яго вынікаў і выпрацоўкі рэкамендацый для прыняцця рашэнняў у сферы цэнаўтварэння. У рабоце пасяджэння Экспертнага савета таксама ўдзельнічалі прадстаўнікі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Федэрацыі прафсаюзаў, Нацыянальнага банка, Нацыянальнага статыстычнага камітэта, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Асноўнымі тэмамі абмеркавання сталі эканамічная сітуацыя ў краіне і пытанні развіцця прамысловасці.

Нагадаем, рэгуляванне цэн на сацыяльна значныя тавары ў Беларусі, згодна з нядаўняй пастановай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, працягнута да 31 снежня. У дакуменце названы сацыяльна значныя тавары: сметанковае масла і сланечнікавы алей, пшанічная мука, соль, некаторыя віды круп, хлеба, мяса, свежай і свежамарожанай рыбы, сыру, малака, яйкі, дзіцячае харчаванне, чорны чай. Вызначаны таксама гранічныя нарматывы рэнтабельнасці, які ўключаны ў адпускныя цэны вытворцаў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

МЕРКАВАННЕ

## Навошта ўсё ўскладняць?



**Сёння ў краіне працуюць дыялогавыя пляцоўкі, прадстаўнікі рэальнага сектара эканомікі дзеляцца сваімі заўвагамі наконт унясення паправак у заканадаўства. Сваё меркаванне выказаў і Сяргей АНЮХОЎСКІ, дырэктар прадпрыемства «Чырвоны харчавік», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Любое прадпрыемства павінна развівацца, мадэрнізавацца. «Чырвоны харчавік» не выключэнне. Сёння мы задзейнічаны ў інавацыйнай праграме развіцця Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляем мармеладную вытворчасць у Слаўгарадзе. Праект імпартазамяшчальны, слаўгарадская лінія будзе выраблянь, умоўна кажучы, 3500 тысяч тон кандытарскіх вырабаў — плюс 30 % да таго, што сёння стварае «Чырвоны харчавік». Гэта модульная лінія значылася ў праекце прадпрыемства яшчэ ў 2014 годзе, калі я толькі прыйшоў туды кіраўніком. Я разумею, што рабіць яе ў Бабруйску — азначае ўлазіць у камерцыйныя крэдыты, а гэта вялікія рызыкі. Мы пайшлі па больш адказным шляху, але ўсё робім максімальна асцярожна. Трэці год рэалізуем праект, і хацелася б паскорыцца з уводам, але разумею, што лепш не зрабіць лішні крок, чым потым панесці адказнасць. Права на рызыку і памылку ў нас няма. У заканадаўстве адназначна павінны адбыцца перамены. Бо там ёсць моманты, якія ўсё ўскладняюць і перашкаджаюць справе. Просты прыклад. Ва ўмовах пандэміі хацелі адкрыць інтэрнэт-краму. Па вялікім рахунку, што можа быць прасцей? Чалавек нешта заказаў, разлічыўся анлайн, забраў тавар. Калі такая крама належыць замежнаму ўласніку, то так яно і ёсць. А вось ад беларускага прадаўца Міністэрства антыманапольнага рэгулявання патрабуе яшчэ і работніка, які павінен разлічваць пакупніка, тэрмінала, якім спажывец можа скарыстацца, а гэта ўсё — нічым не апраўданыя затраты. Наогул, навошта ўсё ўскладняць там, дзе можна зрабіць прасцей?

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШАШКІ Ў ТРЭНДЗЕ

## Беларускія шашысты не здаюцца!

**У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках прайшоў чэмпіянат Беларусі па шашках-100. У першай лізе турніру спартсмены спрачаліся за пуцёўкі ў вышэйшую лігу чэмпіянату краіны, які запланаваны на 2021 год. Усяго ў фінальнай групе спаборніцтваў выступілі 24 мужчыны і 19 жанчын. Турнір праходзіў у дзевяць тураў па швейцарскай сістэме. Згодна з ёй, турнір праходзіць без выбывання, у кожным туры паміж сабой сустракаюцца сапернікі, якія маюць роўную колькасць балаў. Такім чынам выключаюцца партыі паміж рознымі па сіле апанентамі, што дазваляе вызначыць пераможцу пры невялікай колькасці тураў.**

У выніку спаборніцтваў уладальнікамі пуцёвак у вышэйшую лігу чэмпіянату Беларусі 2021 года сталі майстры спорту Ігар Царэшка, Алег Чэпа і Юрый Цімановіч. Кампанію ім склаў кандыдат у майстры спорту Яўген Жукоўскі. Сярод жанчын у вышэйшую лігу прайшлі кандыдаты ў майстры спорту Дар'я Нікіфарава, Яўгенія Швед, Любоў Кобрына. Узначаліла каманду найлепшых шашыстак майстар спорту Настасся Барышава.

У сувязі з цяжкай эпідэміялагічнай сітуацыяй сёлета беларускія спартсмены актыўна ўдзельнічалі ў анлайн-спаборніцтвах па шашках. На юнацкім чэмпіянаце Еўропы, які прайшоў у новым фармаце ў верасні, беларусы паказалі высокія вынікі. Аляксандра Тарасенка перамагла сярод дзяўчат 14 гадоў, а Дзяніс Лазавік заняў трэцяе месца ў групе юнакоў 13 гадоў.

Спаборніцтвы па шашках працягваюцца ў рэальным і віртуальным фарматах.

**Яўген САЛАНОВІЧ, майстар спорту,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 105

Наступную задачу склаў наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму).*



**Белыя:** Kpg6, Фb4, Лh7, Ch2, Ka4, Kd6 (6).

**Чорныя:** Kpd5, Ca8, Kf1, Kf2, пп. b6, d2, d7, e5, e6 (9).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Сёлетні чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў і дзяўчат па зразумелых прычынах праходзіў як анлайн-турнір. У розных узроставых катэгорыях за Беларусь выступалі амаль два дзясяткі юных шахматыстаў. Найлепшы вынік паказала чэмпіёнка краіны сярод жанчын Аляксандра Тарасенка з Брэста, якая заваявала залаты медаль сярод дзяўчат да 14 гадоў (7 перамог, 1 пройгрыш і 1 нічыя). Сярод юнакоў да 14 гадоў «бронзу» атрымаў Дзяніс Лазавік. Добрыя вынікі паказалі таксама Ксенія Норман (4-е месца сярод дзяўчат да 14 гадоў), Ксенія Зелянцова (5-е месца сярод дзяўчат да 16 гадоў) і Арцём Бяляўскі (5-е месца сярод хлопчыкаў да 12 гадоў).

Вось некалькі пераможных партый новай чэмпіёнкі Еўропы са згаданага спаборніцтва.

Аляксандра Тарасенка — Эліф Кескін (Турцыя). 1. e4 c5 2. c3 d5 3. ed Ф:d5 4. d4 cd 5. cd Kf6 6. Kf3 g6 7. Kc3 Фa5 8. Cc4 Cg7 9. Ke5 0-0 10. 0-0 a6 11. Ce3 b5 12. Фf3 Лa7 13. Cb3 Лc7 14. Cf4 Cb7 15. Фh3 e6 16. Kd3 Л:c3 17. bc Ф:c3 18. Ce5 Kc6 19. Лac1 Фa5 20. Kc5 Cc8 21. C:f6 C:f6 22. Ke4 Cg7 23. Л:c6 Cb7 24. Л:e6 fe 25. Ф:e6+ Kph8 26. Kd6 C:d4 27. K:b7 Фd2 28. Kd6 C:f2+ 29. Kph1 Kpg7 30. Фe5+ Kph6 31. Kf7+ Л:f7 32. C:f7 Фd3 33. Фf4+ g5 34. Ф:f2 Фd6 35. Фf6+ Ф:f6 36. Л:f6+ Kpg7 37. Л:a6 Kp:f7 38. Лb6, 1:0.

Аляксандра Тарасенка — Луіза Башыліна (Германія). 1. e4 c5 2. Kf3 e6 3. c3 d5 4. ed ed 5. d4 Kf6 6. Ce3 c4 7. b3 cb 8. ab Cd6 9. Cd3 Kc6 10. 0-0 0-0 11. Kbd2 h6 12. h3 Ce6 13. c4 b6 14. Лc1 Kb4 15. Cb1 Лc8 16. c5 Cb8 17. Лe1 Kd7 18. Kf1 bc 19. dc Фa5 20. Фd4 Ka6 21. Cd2 Фb5 22. b4 Фc6 23. Фd3 Kf6 24. b5 K:c5 25. bc K:d3 26. C:d3 Лfd8 27. Ca6, 1:0.

Агнеса-Стафанія Тэр-Авецісяна (Латвія) — Аляксандра Тарасенка. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. Kd2 Kc6 4. c3 de 5. K:e4 e5 6. d5 Kce7 7. Cc4 f5 8. Kg5 Фd6 9. Фb3 a6 10. a4 Kf6 11. Cd2 Ke:d5 12. 0-0-0 c6 13. K1f3 h6 14. Kh3 Ce7 15. Лhe1 Ke4 16. Ce3 Ce6 17. Ф:b7 0-0 18. Фb3 Лab8 19. Фa2 Лfd8 20. Kd2 Ke:c3 21. bc K:c3 22. C:e6+ Kph8 23. Фc4 Фa3+ 24. Kpc2 Фb2x

* * *

Цікавы сёлета атрымаўся чэмпіянат Брэста, дзе першае і другое месцы падзялілі майстры Антон Сягоднік (ён першы па дадатковых паказчыках) і Дзмітрый Буланаў. Вось адна з партый чэмпіёна.

Міхаіл Яшчук — Антон Сягоднік. 1. e4 e5 2. Kf3 Kf6 3. d4 ed 4. e5 Ke4 5. Фe2 Kc5 6. K:d4 Kc6 7. K:c6 dc 8. Ce3 Ce6 9. Kc3 h5 10. Лd1 Фh4 11. Лd4 Cg4 12. Фd2 Ke6 13. Лd7 Лd8 14. Л:d8+ Ф:d8 15. Ф:d8+ Kp:d8 16. Ke4 Cf5 17. Cd3 C:e4 18. C:e4 Cc5 19. Kpe2 Kpe7 20. c3 Лd8 21. f4 f6 22. Лf1 C:e3 23. Kp:e3 Kc5 24. Cc2 Лd5 25. c4 Лd8 26. Cg6 h4 27. Лf3 Лd1 28. Лh3 Лe1+ 29. Kpf2 Лa1 30. Л:h4 Л:a2 31. Лh7 fe 32. fe Л:b2+ 33. Kpg3 Ke6 34. Лh8 Kf8 35. Cf5 a5 36. Kpf4 Л:g2 37. Лh3 a4 38. Лa3 b5 39. Ce4 Ke6+ 40. Kpf3 Л:h2 41. Kpg3 Лb2 42. C:c6 Лb3+ 43. Л:b3 ab 44. cb b2 45. Ce4 Kc5 46. Cb1 Ka4 47. Kpf3 Kc3 48. Cc2 b1Ф 49. C:b1 K:b1, 0:1.

А першынство Баранавіч сярод дарослых сёлета выйграў 8-гадовы Радзівон Сідарэня. Другое і трэцяе месцы, дарэчы, занялі таксама школьнікі.

У анлайн-турніры на сайце chess.com (707 удзельнікаў) беларускі гросмайстар Сяргей Жыгалка заняў 7-е месца, але потым саступіў у першым матчы стадыі плэй-оф.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Лh6! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Уладзімір Ізотаў (апошні рашыў і папярэднюю задачу).

**Вадзім ЖЫЛКО.**



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Грэйцеся ў добрай кампаніі...

**Восень, бясспрэчна, прыгожая пара, але, калі надвор'е змяняе плюс на мінус, хочацца ўтульнасці, цяпла, бавіць час так, каб энергія і душэўная раўнавага зберагаліся. Варыянт знайсці час для прагляду добрага фільма ці перадачы, пагадзіцеся, зноў становіцца актуальны. Таму прапануем вам анонс, дзе ёсць і камедыі, апрабаваныя часам, і праграмы, за праглядам якіх прыемна адпачыць, а можа, і паразважаць.**



У эфіры «Беларусь 3» гледачам рыхтуюць паказ многіх цікавых фільмаў. У прыватнасці, можна ўбачыць меладраму «Нетэрміновая вясна» вытворчасці «Беларусьфільма». Кінастужка была знята ў 1989 годзе па матывах апавяданняў «Нетэрміновая вясна», «Руся», «Князь у князях», «Мухі», «Жураўлі», «Каўказ», аповесці «Сухадол», а таксама дзённікаў і артыкулаў нобелеўскага лаўрэата Івана Буніна (здымкі прымеркавалі да 120-годдзя пісьменніка). Паводле сюжэта, гісторыя пачынаецца з таго, што настаўнік Аляксей Дзмітрыевіч праз некалькі гадоў пасля рэвалюцыі вяртаецца ў закінуты маёнтак. З ім у героя звязаны ўспаміны пра першае і адзінае каханне. Яго нявеста марыла стаць мастачкай, і маладыя людзі паядналі б свае лёсы, калі б не трагічныя абставіны, выкліканыя даўняй сямейнай таямніцай. Аднак праз чатыры гады Руся нечакана зноў з'яўляецца ў жыцці настаўніка і просіць яго правесці з ёю некалькі дзён у тых мясцінах, дзе іх спаткала шчасце... Што было далей, зможам даведацца падчас прагляду фільма ў чацвер, 22 кастрычніка. Дарэчы, у нядзелю гэтую кінастужку пакажуць таксама ў эфіры канала «Культура».

А вось на «Беларусь 2» чакаецца цікавінка для аматараў рэаліці-шоу. Праект «Паненка-сялянка» зноў з'явіцца на экранах. Як вядома, да добрага хутка прывыкаеш, а вось ці магчыма змяніць свой лад жыцця на нязвыклы і супрацьлеглы за тры дні, нам прадэманструюць чароўныя ўдзельніцы праграмы. Дзяўчат чакае шмат цікавых, незвычайных і нават шакавальных выпрабаванняў. Але можна сказаць дакладна — гледачы не здолеюць адарвацца ад экранаў, назіраючы за польска-ўкраінскім сезонам праграмы. Як пройдзе «абмен» і з якімі высновамі дзяўчаты вернуцца пасля ўсіх пературбацый, зможаце даведацца пачынаючы з наступнай пятніцы.

Таксама на «Беларусь 2» нас чакае паказ фільма японскай вытворчасці «Магазінныя злодзеі» ад рэжысёра Хіракадзу Карыэда. У цэнтры апавядання сям'я, якая мае праблемы з фінансамі: яны жывуць на пенсію бабулі. Таму галоўнаму герою і яго прыёмнаму сыну час ад часу даводзіцца красці ў крамах. І вось аднойчы Асама Сібат, вяртаючыся дадому, падбірае на вуліцы дзяўчынку. Яго жонка, хоць і незадаволеная, але прымае дзіця. Усе жывуць шчасліва, пакуль аднойчы па тэлевізары не бачаць аб'яву пра зніклую дзяўчынку. Гэтая навіна кардынальна змяняе іх жыццё... Як адзначаў сам рэжысёр фільма, на некаторыя сцэны яго натхніла ўласная біяграфія. І «Магазінныя злодзеі» сталі пятай яго работай, паказанай на Канскім кінафестывалі. Фільм атрымаў прэмію «Сезар» у намінацыі «Найлепшы фільм на замежнай мове» ў Францыі ў мінулым годзе, а таксама быў сярод намінантаў многіх вядомых і прэстыжных кінафестываляў ва ўсім свеце.

# Балет «Шчаўкунок» на «Беларусь 3»

**На сцэне Вялікага тэатра Беларусі 13 кастрычніка адбылася прэм'ера балета Пятра Чайкоўскага «Шчаўкунок» у новай аўтарскай рэдакцыі харэографа і пастаноўшчыка, народнага артыста СССР і Беларусі Валянціна Елізар'ева. Тэлеканал «Беларусь 3» першы правёў запіс абноўленага спектакля і пакажа яго ў эфіры 1 лістапада.**

Ва ўсе гады казачная гісторыя Шчаўкунка, расказаная на мове пластыкі, прыцягвала ўвагу як самых юных, так і дарослых аматараў балета. Упершыню прадстаўлены ў 1982-м, сусветна вядомы спектакль у пастаноўцы дырыжора Аляксандра Анісімава, харэографа Валянціна Елізар'ева і сцэнографа Яўгена Лысіка стаў адной з візітак Вялікага тэатра Беларусі.

У 88-м сезоне маэстра Валянцін Елізар'еў прапануе публіцы сваё аўтарскае пераасэнсаванне «Шчаўкунка», а ў якасці дырыжора-пастаноўшчыка новай рэдакцыі выступіў Вячаслаў Чарнуха-Воліч.



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Здымачная група медыяхолдынга разам з першымі гледачамі наведала прэм'ерны паказ «Шчаўкунка», а ўсе астатнія ўбачаць HD-тэлеверсію спектакля ў нядзелю, 1 лістапада, на сацыякультурным тэлеканале.

**Алена ДРАПКО.**

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 18.30, 19.20 Меладрама «Моцная слабая жанчына» (16+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Ненавіджу» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.10** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**21.55 Серыял «След» (16+).**
**23.50** Арэна.
**0.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.30** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Даравацъ» (16+).
**10.10** Камень, нажніцы, папера (16+).
**10.45** «Да пабачэння» (16+).
**11.35 Маст. фільм «Бель і Себасцьян: сябры навек» (6+).**
**13.15 Фэнтэзі «Мэры Попінс вяртаецца» (6+).**
**15.20** Анімацыйны фільм «Атлантыда: закінуты свет» (0+).
**16.55 Прыгоды «Піраты Карыбскага мора: куфар мерцвяка» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.55** «Хачу ў тэлевізар!»
**0.00 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Стромга з яблыкамі.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25, 12.20** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**9.55** «Кадры жыцця». Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Наталля Тамела.
**10.45, 18.55 «Дзейнічай па абставінах». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.55 «Жаніх з таго свету». Маст. фільм (12+).**
**13.45** «Наперад у мінулае».
**14.15, 21.40 «Нармандыя — Нёман». Маст. фільм (12+).**
**16.15** «Навукаманія» (6+).
**16.40** «Славянскі базар у Віцебску — 2019». Ірына Дарафеева з праграмай «Акрыляй».
**18.25** «Камертон». Рэжысёр Галіна Адамовіч.
**20.05** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Ігар Старыгін (12+).

### Беларусь 5

**7.00** Спорт-мікс.
**7.10, 17.00** Плаванне. Міжнародны турнір.
**9.15** Вынікі тыдня.
**9.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**10.40** Спартыўныя бальныя танцы. Міжнародны турнір.
**12.45** Вось гэта спорт!
**13.00, 19.00** Тэніс. WTA.
**20.50** На грані фолу. Футбольны агляд.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лідс» — «Вулверхэмптан». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

### АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], 20.30, 0.50** Нашы навіны.
**9.15** «Контуры».
**10.05** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15 Серыял «Ясенін» (12+).**
**12.10** «Модны прыгавор» (6+).
**13.15, 22.15 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.00** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Масгаз». Новая справа маёра Чаркасава. Катран (16+).
**22.15 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Джокер». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**21.20** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.40** «Мінтранс» (16+).
**1.25** «Самая карысная праграма» (16+).

### МІР

**5.00 Серыял «Запасны інстынкт». 1—4-я серыі [СЦ] (16+).**
**8.15, 10.10 Серыял «Мой асабісты вораг». 1—4-я серыі (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.50, 19.25 Серыял «Даішнікі». 1—4-я серыі [СЦ] (16+).**
**22.40, 3.05** «Гульня ў кіно» (12+).
**23.25, 0.15** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.50 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**
**3.35 Маст. фільм «Трактарысты» [СЦ] (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.20** «Таямніцы Беларусі».
**13.20** «Наша справа» (16+).
**13.35** «Плюс-мінус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Маскоўская борздая» (12+).**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Вяртанне» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Белавежская пушча (6+).
**6.30** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.10** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** «Справа ўрачоў» (16+).
**9.10, 10.20 Дэтэктыў «Сабачая работа» (16+).**
**13.20, 16.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50 Серыял «Ціхае паляванне» (16+).**
**16.20, 19.35, 21.45, 23.05** Сёння. Галоўнае.
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00. 19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**21.50** «НЗ.by».
**22.05 Серыял «Званар» (16+).**
**23.20 Серыял «Вонкавае назіранне» (16+).**
**0.20 Дэтэктыў «Пляж» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.20,18.25, 21.05, 1.30** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.30** «Мультпарад» (6+).
**7.30, 16.25, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.25, 19.50 Серыял «Аднойчы ў Адэсе» (16+).**
**10.10** Дак. фільм «Грэнландыя. Шэпт лёду» (16+).
**11.00** Глядзім усёй сям'ёй: «Фантастычныя стварэнні. Злачынства» (12+).
**13.15, 18.30 Серыял «Ніткі лёсу» (12+).**
**14.50 Серыял «Дзве зімы і тры леты» (16+).**
**17.20 Серыял «Рызыкоўны раман» (16+).**
**19.15** «Суперлато».
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Камедыя «Хэпі-энд» (12+).**
**22.40 Трылер «Павуцінне хлусні» (16+).**
**0.50 Серыял «Хадзячыя мерцвякі» (18+).**







### ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**9.05** М/ф «Царэўны» (6+).
**9.25** М/ф «Скубі Ду» (6+).
**10.00** «Дзіцячы КВЗ» (6+).
**11.00** «Рускія не смяюцца» (16+).
**12.05** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.55** Анімацыйны фільм «Чалавек-павук: праз сусветы» (6+).
**15.05, 22.00, 0.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**17.10** Фантастыка «Хэнкок» (16+).
**19.00** Трылер «Веном» (16+).
**21.00** «Поўны блэкаўт» (16+).
**22.40** «Справа была вечарам» (16+).
**23.45** «Наш рамонт» (16+).
**1.40** «Проста кухня» (16+).
**2.10** «Рогаў у справе» (16+).
**3.00** «Даеш моладзь» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Дзе я яго бачыў?». «Апошняя нявеста Змея Гарыныча». «Незвычайны матч». «Старыя знаёмыя». М/ф.
**7.45** «Чыпаліна». Маст. фільм [СЦ].
**9.10** «Звычайны канцэрт».
**9.40** «Мы — грамацеі!»
**10.20** «Чарговы рэйс». Маст. фільм [СЦ].
**11.55** «Сузор'е-Йолдызлык. Здабытак рэспублікі». Дак. фільм.
**12.50** Дыялогі пра жывёл. Заапарк Растова-на-Доне [СЦ].
**13.30** «Іншыя Раманавы». «Нараджэнне ВПС» [СЦ].
**14.00** Да 150-годдзя з дня нараджэння Івана Буніна. «Гульня ў бісер».
**14.40, 0.20** «Нетэрміновая вясна». Маст. фільм [СЦ].
**16.50** «Энцыклапедыя загадак». Дак. серыял [СЦ].
**17.20** Вялікія выканаўцы. «Эміль Гілельс. Адзіны і непаўторны». Дак. фільм.
**18.00** «Пешшу...». Дамы з выглядам на сцэну [СЦ].
**18.35** «Рамантыка рамanса». Лідзіі Русланавай прысвячаецца...
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Бацька». Дак. фільм [СЦ].
**21.10** «Без сведкаў». Маст. фільм [СЦ].



**22.40** Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Балет «Браты Карамазавы».
**2.30** «Піф-паф, вой-вой-вой!». «Адваротны бок месяца». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1969-ы. 1-я частка. 2011 год (12+).
**7.00, 9.45, 11.00, 13.10, 14.35, 17.25, 20.20, 21.45, 23.20, 2.20, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Маст. фільм «Дарагі Эдысан» (16+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу».
**12.00** Маст. фільм «Паветраны рамізнік» (6+).
**13.30** Па старонках праграмы «Вакол смеху». 1987 год (16+).
**15.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Ранішняя шаша» (12+).
**18.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**19.00** «Пад знакам задыяка. Скарпіён». 1992 год (18+).
**22.00** Маст. фільм «Калі мне будзе 54 гады» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Амаль смешная гісторыя» (16+).



### EuroSport 1

**0.30, 6.00, 20.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**2.30, 8.00, 17.15** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
**4.00, 22.30** Веласпорт. «Вуэльта» (12+).
**9.30** Веласпорт. «Тур Фландрыі» (12+).
**10.40, 18.35** Веласпорт. Парыж — Рубэ.

### Кінакамедыя

**0.20** Лёгкія паводзіны (16+).
**2.10** Краіна цудаў (12+).
**4.00** Нявеста любой цаной (16+).
**5.50** Як адмыць мільён (12+).
**8.15** Крутая Джорджыя (16+).
**10.25** Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).
**12.20** Не магу дачакацца (16+).
**14.15** Вельмі небяспечная штучка (16+).
**15.55** Герой супермаркета (12+).
**17.40** Таўстун супраць усіх (16+).
**19.30** Старскі і Хатч (12+).
**21.25** Паляўнічы за галовамі (16+).
**23.30** Сутэнёр (16+).

### ТБ3

**6.00, 8.15** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.45** «Улегцы» (12+).
**10.20** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.10, 2.05** Серыял «Залатая пастка» (16+).
**15.15** Анімацыйны фільм «Герой СамСам» (6+).
**16.45** Серыял «Каханне ў вышуку» (12+).
**20.35** «ТБ3 вядзе расследаванне» (16+).
**21.40** «Асцярожна ашуканцы!» (16+)
**22.20** «Пляж». Маст. фільм (16+).
**0.35** «Грым». Серыял (16+).
**5.20** «Без падману» (16+).

### ТБ1000

**7.15** Гномеа і Джульета (12+).
**8.55** Двухсотгадовы чалавек (6+).
**11.10** Усё ці нічога (16+).
**13.10** Аднакласнікі (16+).
**15.00** Аднакласнікі-2 (16+).
**16.45** У імя караля: гісторыя аблогі падзямелля (12+).
**19.00, 5.00** Робін Гуд: пачатак (16+).



**21.00** Робін Гуд (16+).
**23.25** Робін Гуд: Прынц зладзеяў (12+).
**1.55** Забытае (16+).
**3.25** Што хавае хлусня (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**7.05** Няўлоўныя (16+).
**8.45** Няўлоўныя: Апошні герой (16+).
**10.00** Няўлоўныя: Бангкок (16+).
**11.30** Няўлоўныя: Джэкпот (16+).
**13.00** Тры волаты і Шамаханская царыца (12+).
**14.20** Тры волаты на далёкіх берагах (6+).
**15.35** Тры волаты: Ход канём (6+).
**16.55** Прыцягненне (12+).
**19.00** Спадарожнік (16+).
**21.05** Час Першых (6+).
**23.40** Гагарын. Першы ў космасе (6+).
**1.35** 14+ (16+).
**3.25** Таямніца пячаткі дракона (6+).
**5.30** Джунглі (12+).

### National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**7.40, 3.35** Аўта-SOS (16+).
**8.30** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**9.25** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**11.05** Жанчыны-ваяры вікінгаў (16+).
**11.55** Інстынкт выжывання (16+).
**14.25** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**15.15** Служба бяспекі аэрапорта: Перу (16+).
**17.40** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**23.30** Фабрыка ежы (16+).
**1.35, 5.55** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**2.00** Асушыць акіян (16+).

### Discovery

**8.00** Махінатары (12+).
**8.45, 21.02** Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
**9.10** Смяротны ўлоў (16+).
**10.00** Залатыя шлях Паркера Шнабеля (16+).
**10.50, 5.42** Атака Шака (16+).
**11.41** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.23, 23.09** Дальнабойшчык у Інданезіі (12+).
**14.14, 7.14** Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
**15.05** Браты Дызель (12+).
**19.20** Як гэта ўладкавана? (12+).
**20.11** Як гэта зроблена? (12+).
**21.27** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**0.00, 6.28** Вартавыя падземкі (12+).
**0.51** Олі Сміт: па слядах эля (16+).
**1.42** Паляўнічыя на склады (16+).

---

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## аўторак, 20 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).**
**10.45, 12.10, 18.30, 19.20 Меладрама «Дзевяць жыццяў».**
**13.05, 14.45, 15.25 Меладрама «Забароненае каханне» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 23.55** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**23.40** Сфера інтарэсаў.
**00.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.10** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**9.45, 20.40** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**10.20, 22.25** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.15, 18.15 Серыял «Ускрыццё пакажа» (16+).**
**13.05, 23.35 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**13.55** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**14.55** М/с «Стыч!» (6+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.25 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.15** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.20** «Трэці лішні» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Лешч у гарчыцы.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25,12.20** «Гэты дзень».
**8.30, 18.15 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**9.45, 23.15** «Паляўнічыя і ведзьмы. Радавы праклён». Дак. фільм з цыкла «Зваротны адлік» (12+).
**10.10, 16.00 «Стацкі саветнік». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**12.55, 21.05** Апошні дзень» (12+).
**13.30, 21.40 «Максім Перапяліца». Маст. фільм (12+).**
**15.05** «Майстры і куміры». Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Пячынская.
**17.50** «Арт-гісторыі». Тайна калекцыі Вільгельма Катарбінскага.
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Суразмоўцы». Алесь Камароўскі.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.40** «Артэфакты». Бабруйскі шлем.

### Беларусь 5

**7.00** Спорт-мікс.
**7.10** Плаванне. Міжнародны турнір.
**9.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**10.10** На грані фолу. Футбольны агляд.
**11.15** Спартыўныя бальныя танцы. Міжнародны турнір.
**13.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**13.55** Спорт-кадр.
**14.30** Тэніс. WTA.
**17.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск — «Шахцёр» (Салігорск). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Дынама» (Кіеў) — «Ювентус» (Італія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Аналіз гульнявога дня. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Дзённік.

### АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.50** Нашы навіны.
**9.15** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Грамадзянская абарона» (16+).
**12.10** «Модны прыгавор» (6+).
**13.15, 22.15 Серыял «Ніткі лёсу» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.00** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Масгаз». Новая справа маёра Чаркасава. Катран (16+).

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20, 0.35** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Джокер». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».

### МІР

**5.00** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**5.25, 10.10 Серыял «Жыць спачатку» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.50, 19.25 Серыял «Даішнікі» [СЦ] (16+).**
**22.40, 3.05** «Гульня ў кіно» (12+).
**23.25, 0.15** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.50 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**
**3.35 Маст. фільм «Гарачыя дзянькі» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Маскоўская бораздая» (12+).**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Вяртанне» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Гарады Беларусі» (6+).
**6.40, 16.20, 19.35, 21.45, 23.05** Сёння. Галоўнае.
**6.50** «Здароўе» (12+).
**7.30, 8.25** «Справа ўрачоў» (16+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.50 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40, 22.50** «НЗ.by».
**10.20, 23.20 Серыял «Вонкавае назіранне» (16+).**
**11.15 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.20, 16.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50 Серыял «Ціхае паляванне» (16+).**
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00, 19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**22.05 Серыял «Званар» (16+).**
**0.20 Дэтэктыў «Пляж» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.00, 17.25, 21.10, 1.30** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.10** «Мультпарад» (6+).
**7.30, 16.05, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
— Гэта яскравы прыклад таго, як плённа могуць працаваць органы мясцовага самакіравання, дэпутаты і мясцовая ўлада разам, — кажа Аляксандр Пікуля. — Калі паставілі першы слуп, мне тэлефанавалі настаўнікі, каб паведаміць радасную навіну. Я добра ведаю, як яны чакалі гэтага моманту. Яны ж таксама нясуць адказнасць за бяспеку дзяцей. Але больш за ўсіх удзячны бацькі — іх нарэшце пачулі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Дзякуючы ініцыятыўнасці вулічкама Аляксандра Пікулі каля дзіцячага садка і школы з'явілася вулічнае асвятленне.*

## Каментарый у тэму

**Старшыня Магілёўскага гарсавета Максім ГУРЫН:**

— Калі гараджане звяртаюцца да нас па дапамогу, яны вельмі спадзяюцца, што мы іх не падвядзём. Але вельмі часта ўсё ўпіраецца ў грошы. І мы шукаем спосаб, як выйсці са складанай сітуацыі . Калі ўсё атрымліваецца, адчуваеш вялікае задавальненне.

Каля 33-й школы сапраўды быў неасветлены ўчастак, але гэты аб'ект у гарадскі план мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні на сёлета не ўваходзіў. Прыйшлося шукаць спосаб, як вырашыць пытанне, бо бяспека дзяцей заўсёды на першым месцы. Звярнуліся да кіраўніка магілёўскага прадпрыемства «Гарсвятло» Аляксандра Пашкевіча, які з'яўляецца дэпутатам абласавета, абмеркавалі праблему з кіраўніцтвам упраўлення камунальных прадпрыемстваў, разам выехалі на месца, каб вызначыцца, якія апоры ставіць і якую падсветку рабіць. Прыйшлося дырэктару «Гарсвятла» задзейнічаць свае рэзервы. У такіх пытаннях дэпутатам вельмі часта даводзіцца выкарыстоўваць сваё службовае становішча, бо народныя абраннікі яшчэ і дзесьці працуюць, а грамадскімі справамі займаюцца, як у гэтым выпадку, паралельна.

# Бяспека як трэнд жыцця на вёсцы

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

— На асаблівым кантролі, безумоўна, таксама жыллё сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Пастаянныя адрасаты падобных рэйдаў і домаўладальнікі, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі, — расказвае **старшыня Прыбарскага сельскага Савета Ірына ГОРЛЕНКА.** — Летась па некалькіх адрасах меліся заўвагі па супрацьпажарным стане пячнога абсталявання, сутуацыя была ў мяне на кантролі. Трэба адзначыць, што людзі выправіліся, печкі ў іх адрамантаваны, перад гэтым ацяпляльным сезонам прэтэнзій да іх не ўзнікла, — дадала Ірына Віктараўна.

Падчас прафілактычнага рэйду, на шчасце, сур'ёзных парушэнняў выяўлена не было, адзначылі супрацоўнікі МНС.

— У некаторых дамах, праўда, адсутнічаў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, — звяртае ўвагу **інспектар Гомельскага РАНС Анатоль ДЗІЧКОЎСКІ** і тлумачыць, што пры аглядах домаўладанняў на неабходнасць устаноўкі гэтага прыбора звяртаюць асаблівую ўвагу. У ходзе рэйду грамадзяне таксама былі праінструктаваны аб правілах пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі пячнога ацяплення:

— Тапіць у печы варта два разы на суткі — раніцай і ўвечары. Выкарыстоўваць няспраўнае пячное ацяпленне катэгарычна забараняецца, бо гэта наўпрост вядзе да ўзнікнення пажару. Ні ў якім разе нельга даручаць топку печы дзецям, — падкрэсліў інспектар.

У Прыбары назіральная камісія завітала ў дом пенсіянеркі Тамары Кучынскай. Жанчыне распавялі аб выяўленых недахопах у арганізацыі супрацьпажарнай бяспекі і нагадалі, што іх трэба ліквідаваць у найбліжэйшы час. Сацыяльны работнік патэлефанавала дачцэ пенсіянеркі і папрасіла дапамагчы маці ў гэтай справе.

Між тым супрацоўнікі «Гомельаблгаза» і «Энерганагляду» праверылі ў доме жанчыны спраўнасць электраабсталявання і праводкі, газазабеспячэння.

— Работа назіральных камісій неадночы даказвала сваю эфектыўнасць, — падкрэсліваюць удзельнікі рэйду. — Бо менавіта дзякуючы сумесным намаганням



атрымліваецца выявіць фактары, якія пагражаюць бяспецы грамадзян, і своечасова іх ліквідаваць.

Адна з галоўных задач назіральных камісій — прасачыць меры рэагавання па кожным факце парушэння бяспекі жыццядзейнасці грамадзян. Такая форма кантролю асабліва эфектыўная ў рабоце з грамадзянамі, якія злоўжываюць алкаголем, вядуць асацыяльны лад жыцця, маюць запазычанасці па камунальных паслугах.

Пераступіўшы парог домаўладання, суб'екты прафілактыкі прыступаюць да сваёй работы: прадстаўнікі «Гомельаблгаза» аглядаюць катлы, газавыя пліты і звяраюць дадзеныя лічыльнікаў, медыкі ўдакладняюць звесткі пра наведванне паліклінікі, спецыялісты сацыяльнай службы расказваюць аб паслугах, якія можа аказаць цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На кантролі прадстаўнікоў «Энерганагляду» — стан электрычнай праводкі, электрапрыбораў у доме і спраўнасць лічыльнікаў.

Дарэчы, у населеных пунктах таго ж Прыбарскага сельсавета работнікі МНС назіраюць добрую тэндэнцыю: сёння больш за 80 % дамоў у мясцовых населеных пунктах аснашчаны аўтаномнымі пажарнымі апавяшчальнікамі, месцічы карыстаюцца таксама сігналізатарамі ўгарнага газу.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ПА МЕСЦЫ ЖЫХАРСТВА

# ДАПАМОГА НА КОЛАХ

**Для паляпшэння якасці медыцынскага абслугоўвання сельскага насельніцтва пры Валожынскай цэнтральнай раённай бальніцы некалькі месяцаў таму створаны перасоўны медыцынскі комплекс.**



Медустанова на колах курсіруе паміж населенымі пунктамі раёна згодна з графікам, за дакладнасць якога нясе адказнасць загадчык райпаліклінікі Аляксандр Бурак. Менавіта ён патлумачыў сэнс работы, якую па-сапраўднаму можна лічыць аператыўнай. Мабільны комплекс дапамагае супрацоўнікам амбулаторый і фельчарска-акушэрскіх пунктаў наведвацца да пацыентаў па месцы іх жыхарства, забяспечвае высокі працэнт дыспансерызацыі, паведамляе раённая газета «Працоўная слава».

З выгляду перасоўны комплекс нагадвае звычайны аўтобус, але, зазірнуўшы ўнутр, разумееш, што трапіў у сучасную міні-паліклініку. У невялікім пакоі пацыенты могуць прысесці ў чаканні сваёй чаргі. Затым — галоўны кабінет. Гэта ўжо паўнавартасная прыёмная, дзе ёсць стол, месца для ўрача і пацыента, кушэтка, на якой з дапамогай пераноснага кардыёграфа робіцца кардыяграма. Яшчэ адзін кабінет разлічаны на прыём жанчын, дзе для работы акушэркі прадугледжана ўсё неабходнае абсталяванне. Комплекс аснашчаны ўмывальнікамі, ацяпляльнымі прыборамі, вентылятарам. Да таго ж кіраўніцтва паліклінікі паклапацілася і пра тое, каб у наяўнасці пастаянна былі неабходныя дэзсродкі.

На мінулым тыдні супрацоўнікі Вішнеўскай амбулаторыі наведаліся ў вёску Ганчары Вішнеўскага сельсавета. Загадчык амбулаторыі, урач Аліна Круцько, акушэрка Наталля Рагачэвіч, медыцынскія сёстры Ядвіга Клінцэвіч і Яна Буйко за паўдня прынялі дваццаць пацыентаў. Кожнаму з іх вымяралі артэрыяльны ціск, рабілі кардыяграму, задавалі шэраг пытанняў адносна самаадчування і прыёму прэпаратаў. Аліна Уладзіміраўна літаральна кожнага ведае ў твар, трымае ў памяці ўсе скаргі, што запісаны ў картках амбулаторных хворых, цудоўна арыентуецца ў схемах лячэння, якія прызначала раней. Да наведвальнікаў — толькі індывідуальны падыход. Такая формула — адно з галоўных правіл вішнеўскіх медыкаў. Дарэчы, падчас візітаў у вёскі яны абавязкова прывозяць і неабходныя лекі, за што атрымліваюць асаблівую ўдзячнасць ад бабуль і дзядуляў.

Як растлумачыла Аліна Уладзіміраўна, спецыялістамі Вішнеўскай амбулаторыі са жніўня гэтага года па месцах жыхарства абследавана больш за 100 жыхароў навакольных вёсак. Перасоўная ўстанова дазваляе перыядычна дома наведваць тых пацыентаў, якія маюць сур'ёзныя праблемы з перамяшчэннем. Да такіх людзей медработнікі заходзяць самі.

**Фота Валянціны КРАЎНЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 15 кастрычніка 2020 года.**

# «КАЛІ НІЧОГА НЕ РАБІЦЬ, ГЭТА БУДЗЕ ПРОСТА ГРУДА КАМЯНЁЎ»

## Сакрэты старажытнага Крэва

**Некалькі гадоў таму ў выдавецтве «Звязда» выйшла кніга Анатоля Бутэвіча «Таямніцы Крэўскага замка». А сёння для чытачоў «Звязды» — падарожжа ў засені таямнічых муроў.**

— Калі рыхтаваўся да экскурсіі, гляну ў на карту Крэва і здзівіўся: наша мястэчка нагадвае птушку. Адно крыло — вуліца Савецкая (у народзе яе называюць Радзівонаўка), другое — вуліца Багданаўская і крыху Дзяржынскага, грудзі — там, дзе цяпер знаходзіцца сельсавет, а «хваставая частка» цягнецца да гарадзішча. Сэрца Крэва — гэта плошча, бо калі месцічы дамаўляюцца, то кажуць: «Сустрэнемся на Цэнтры», а раней звалі яе «Месцам» і «Рынкавай плошчай», бо з XVII стагоддзя і асабліва ў XIX стагоддзі, і ў міжваенныя гады на ёй адбываліся кірмашы, прычым гандлявалі тут тканінамі, посудам, прадуктамі і шмат яшчэ якімі таварамі. А на іншай пляцоўцы ля замка прадавалі жывёлу і мяса, — заўважае **мясцовы краязнавец, былы настаўнік Аляксандр КАМІНСКІ.**

### СПРАВА ДЛЯ РАМАНТЫКАЎ?

Ён ужо больш за 25 гадоў цікавіцца гісторыяй родных мясцін, сочыць за рознымі крыніцамі, дзе ўзгадваецца Крэва, параўноўвае старыя фатаграфіі, апытвае старажылаў, і дзякуючы гэтаму можа гадзінамі распавядаць пра родныя мясціны. Напрыклад, як тутэйшыя жыхары засцерагаліся ад эпідэмій і ставілі з чатырох бакоў, дзе быў уезд у горад, камяні ці крыжы з абыдзённікамі, каб абараніць мястэчка ад навалы (дарэчы, адзін з такіх камянёў захаваўся да нашага часу). Зафіксаваў некалькі гісторый, звязаных з магчымым падземным ходам: калі гаспадары спрабавалі рабіць скляпы ў пяцідзесяці-ста метрах ад замка, натыкаліся на цагляную пабудову пад зямлёй. Альбо можна пачуць ад яго пра тое, як мястэчка, што тая птушка Фенікс адраджалася пасля Першай сусветнай вайны. Тады міжнародныя яўрэйскія арганізацыі аказвалі дапамогу з умовай, што мясцовыя жыхары будуць займацца прадпрымальніцтвам. Таму дамкі адначасова былі і жыллём, і гандлёвымі аб'ектамі ці складамі. Калі прыгледзіцеся, заўважыце, што асобныя са старых пабудоў захавалі два ўваходы: адзін для гаспадароў, другі з вуліцы, з ганкам — для пакупнікоў. Засталіся ў мястэчку і глінабітныя пабудовы — у 1929 годзе ў Крэве нават праходзілі курсы для будаўнікоў і ўсім мясцовым дазвалялі наведваць тыя заняткі.

Недасведчаным турыстам краязнавец можа падказаць, што мае сэнс паглядзець у мястэчку. Тут усе цікавосткі не сабраныя ў адным месцы — давядзецца шмат пахадзіць, паездзіць. Акрамя замка, варта звярнуць увагу на касцёл; ён хоць і аднаўлены ў наш час, але менавіта ў Крэве быў пабудаваны адзін з першых на Беларусі касцёлаў! Асобна можна распавесці пра гарадзішча і фартыфікацыйныя збудаванні, якіх з часоў Першай сусветнай вайны засталося багата.

Толькі недасведчаным, «транзітным» гасцям, што заязджаюць у Крэва і робяць сэлфі на фоне разбураных муроў, можа падацца, што ў мястэчку няма чаго рабіць. Ведалі б яны, як у гэтым памыляюцца! Варта толькі завітаць на інтэрнэт-рэсурсы, якія знаёмяць з Крэвам, або наведаць «Крэўскія чытанні» (днямі тут ладзілася ўжо другая такая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, арганізатарамі якой выступаюць Нацыянальная акадэмія навук і Смаргонскі райвыканкам). Але галоўны сакрэт, які дазволіць улагодзіць «птушку» — гэта намаганні шматлікіх апантаных рамантыкаў: даследчыкаў, валанцёраў. Абудзіць цікавасць да мястэчка, напоўніць яго разнастайнымі падзеямі, сабраць багата матэрыялу па гісторыі і культуры дапамагаюць шматлікія ініцыятывы. Да справы далучыліся настаўнікі і школьнікі, мясцовыя творцы. Ля сцен замка праходзяць фэсты і выстаўкі (на жаль, каранавірус сёлета не дазволіў правесці фэст-майстэрню Kreva Create, але свята абавязкова будзе). А чаму б не завітаць у вёску Чухны — каб паглядзець на міні-копію Крэўскага замка, над якой шчыруе рамеснік Сяргей Бандарэнка, ды не прыдбаць адметныя сувеніры? А яшчэ гаспадар плануе зрабіць там вялікі лабірынт. Іншыя актывісты аднаўляюць старыя яўрэйскія могілкі, збіраюць фальклор, фіксуюць гаворкі...



Раскопкі на Крэўскім гарадзішчы X—XIII стагоддзяў.

Але ў той жа час Крэва па-ранейшаму губляе сваіх жыхароў.

— Моладзь раз'язджаецца, з суседніх вёсак едуць у Крэва, а адсюль — хто ў горад ці яшчэ далей, — заўважае Аляксандр Камінскі.

Рэстаўрацыйныя работы, якія сёння вядуцца ў замку, даюць новыя надзеі.

— Асабіста я лічу, што лепш законсерваваць замак у такім выглядзе, як мы яго заспелі. Гэта адлюстравала б гісторыю. Праблема ж сапраўды існуе: побач ажыўленая траса, калі па ёй ідуць вялікія машыны, у людзей нават посуд у буфетах звініць. Мясцовасць у нас балоцістая, зямля трасецца, і за апошнія некалькі гадоў замак разбурыўся больш, чым за цэлае стагоддзе.

### І ПА РУІНАХ МОЖНА ЧЫТАЦЬ ГІСТОРЫЮ

У тым выглядзе, у якім Крэўскі замак дайшоў да нашых часоў, яго немагчыма было б ураταваць, упэўнены **вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, пастаянны кіраўнік раскопак у Крэве Алег ДЗЯРНОВІЧ:**

— Крэўскі замак не захаваўся. Гэта ілюзія. Я кожны год прыязджаю і бачу, што ўсё больш камянёў абвалілася са сцяны. Мы працуем у замку, дзьме вецер, і на нас сыпецца рошчына. Ураταваць замак можна толькі праз працэдуру кансервацыі. Для мяне гэта пытанне не дыскусійнае, я ведаю, што калі нічога не зрабіць, гэта будзе проста груда камянёў. Пры кансервацыі замак у любым выпадку зменіць выгляд. Людзі прызвычаіліся да рваных абрысаў, у іх склалася нейкае рамантычнае бачанне гэтых мясцін. Але ўжо ў 1929 годзе, калі польскія рэстаўратары працавалі над захаваннем помніка, стварылі такі іншы вобраз. А ў 1915-м гэта яшчэ была выдатная пабудова, захаваліся яе здымкі. Людзі могуць падумаць, што з'явіцца больш навабуда, але кансервацыя дапамагае захаваць аўтэнтыку, трэба толькі ўмець гэтую аўтэнтыку разгледзець. Трэба падумаць і пра далейшае выкарыстанне замка як музейнага аб'екта. Прынамсі, у Княжацкай вежы пасля рэканструкцыі можна смела рабіць музеефікацыю. Нашы калегі ў Медніках такое зрабілі. Зразумела, можа ўзнікнуць шмат пытанняў. Напрыклад, праз медніцкую вежу праходзіць шкляны ліфт — рэстаўрацыя там рабілася за еўрапейскія грошы, а ўсе такія аб'екты павінны быць даступныя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Тое ж і з сучаснымі будаўнічымі стандартамі — трэба забяспечыць супрацьпажарную бяспеку, правесці электрычнасць. З аднаго боку, мы кажам пра аўтэнтыку, з другога — не гатовыя жыць як у XIV стагоддзі. Трэба знайсці разумны кампраміс.

***— Што абавязкова трэба ўлічыць пры рэстаўрацыі?***

— Не паўсюль у добрым стане падмуркі. Іх трэба ўмацоўваць. Відавочна, трэба разбіраць аварыйныя часткі. Я разумею, што тэхналагічна гэты працэс непазбежны. Галоўнае пажаданне — калі робяць мур, хацелася б выразна бачыць розніцу паміж аўтэнтычнай і законсерваванай муроўкай, але тут фактычна ў ход ідзе матэрыял замка, камяні. Гэта не тое, што ў Мірскім замку, дзе новы мур можна было падняць па старым цагляным і вельмі лёгка паказаць розніцу. Пры рэстаўрацыі трэба вызначыцца, які аб'ект паказваць — у нас ёсць XIV стагоддзе, сляды XVI стагоддзя; замак вядомы па здымках Яна Булгака пачатку XX стагоддзя, ёсць здымкі пасляваеннага разбурэння, польская кансервацыя, якую добра відаць. Любы гістарычны аб'ект шматслойны. Умоўна кажучы, мы не можам зрабіць замак, напрыклад, такі, які ён быў у 1380 годзе, бо тады давядзецца знішчыць шмат іншага. Крэўскі замак — таксама месца памяці Першай сусветнай вайны, нават варонкі ў двары замка важныя. Трэба пакінуць сляды польскай кансервацыі, як напамін аб працы папярэднікаў. Аўтэнтыка — гэта не толькі XIV стагоддзе, але і XX.

***— Але як захаваць шматслойнасць, і пры гэтым стварыць аб'ект, які будзе выкарыстоўвацца? Ці можна назваць прыклады падобных работ?***

— У нас многа такіх аб'ектаў. Той жа Гарадзенскі замак ці палац у Нясвіжы. У Мірскім замку прачытваюцца XVI, XVIII і XX стагоддзі.

***— Як па археалагічных знаходках можна чытаць гісторыю Крэўскага замка?***

— Сярод самых цікавых знаходак — вялікая колькасць фрэсак у Княжацкай вежы. Мы наогул маем вельмі мала фрэсак XIV стагоддзя. І што яшчэ незвыкла, гэтыя фрэскі знойдзены, як мы мяркуем, у свецкай грамадзянскай пабудове. Значыць, гэтая пабудова была рэпрэзентатыўная, рэспектабельная. Даволі багата фрагментаў фрэсак было знойдзена падчас работы археолага Ігара Чарняўскага, і ў 2012 годзе, калі мы вялі раскопкі ўнутранай прасторы Княжацкай вежы, таксама выйшлі на вялікую колькасць фрагментаў фрэсак. Калі ў 1433 годзе Свідрыгайла штурмаваў Крэўскі замак, абрынуліся скляпенні вежы, і так фрэскі былі пахаваныя ў самым ніжнім ярусе. Пасля, як я мяркую, ніхто гэты завал не перабіраў, вежу проста надбудавалі, аднавілі.

***— Як трэба ўлічваць знаходкі археолагаў пры рэстаўрацыі?***

— Мы даём рэальную фактуру. Напрыклад, калі ўскрывалі Княжацкую вежу, знайшлі слуп, які стаяў у цэнтры, значыць, на яго абапіраліся гатычныя скляпенні. Таксама выявілі пліткі падлогі ў тым жа ніжнім ярусе. Вядома, якая была кафля. Сёлета адшукалі невядомую пабудову, якая раней нідзе не фіксавалася. Цяпер падчас рэстаўрацыйных работ быў зняты завал у тым месцы, дзе замак пацярпеў падчас абстрэлу так званага наступу Керанскага. Завал закрываў частку сцяны; калі яго прыбралі, аказалася, што там захавалася шыкоўная цагляная муроўка. У той час цэгла на замку выкарыстоўвалася толькі ў самых рэпрэзентатыўных і тэхналагічна адказных месцах. І тут раптам пасярэдзіне сцяны ідзе цагляная муроўка. Па яе краях мы знайшлі сляды падмурка, даволі вялікага для XIV стагоддзя будынка.



Сляды эпох на старажытных мурах.

***— Ці выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі падчас работ у Крэўскім замку?***

— Канешне. Дарэчы, для ўзмацнення падмуркаў распрацаваны адпаведны праект. Робіцца свідравіна, раствор ідзе пад падмурак і ўмацоўвае яго. Некалі была зроблена вялікая памылка ў Лідскім замку: там на вапнавы раствор паклалі цэмент. Вапна прапускае вільгаць, а цэмент — не, і ўзнік канфлікт, пачало гнісці. Абвалы сцен замка, якія былі ў 70-я гады, былі часткова звязаны з гэтым. Цяпер для кансервацыі Крэўскага замка распрацаваны адмысловы склад раствору.

***— Якую інфраструктуру трэба ствараць, каб задаволіць турыстаў, што прыедуць глядзець замак?***

— Наведвальнікаў вельмі шмат, заязджае мноства аўтобусаў. А інфраструктура не паляпшаецца. На замак не трапіць — тут зараз будаўнічая пляцоўка. Няма прыбіральні, няма дзе выпіць кавы. Калі вы паедзеце ў Гальшаны, там канкурэнцыя паміж кавярнямі. А як загучала Залессе! Значыць, справа не ў тым, у якім раёне размяшчаецца аб'ект. Крэва знаходзіцца на трасе Мінск—Вільня, сюды заязджаюць расіяне, палякі, літоўцы. Кансервацыя і рэстаўрацыя Крэўскага замка павінна даць імпульс для развіцця мястэчка і лакальнага соцыума, тым больш што ў перспектыве замак будзе існаваць не сам па сабе, прадугледжаны пэўная ахоўная зона, цікавыя будынкі вакол замка. Тая ж сінагога можа быць выкарыстана для музейнай экспазіцыі.

***— Але ж у мястэчку ёсць і іншыя аб'екты, якія могуць стаць пунктамі прыцягнення для турыстаў, напрыклад, гарадзішча, дзе вы таксама ведзяце раскопкі...***

— Работы на гарадзішчы маюць дачыненне да вывучэння старажытнай гісторыі Крэва — да моманту пабудовы замка, куды ў XIV стагоддзі перамяшчаецца адміністрацыйны цэнтр. Тое, што замак будуецца на адлегласці ад яго, нармальная для тых часоў з'ява. Адно з важнейшых нашых адкрыццяў — што мы можам гаварыць пра біэтнічнасць старажытнай Літвы. Калі мы пачалі капаць дзесяць гадоў таму Крэўскае гарадзішча, я, прызнацца, чакаў убачыць выразныя сляды балцкіх культур, але мы знайшлі тут раннюю гарадскую культуру, якая карэлюецца з гарадской культурай старажытных усходне-еўрапейскіх гарадоў. Мы можам сцвярджаць, што на гарадзішчы была значная частка славянскага насельніцтва. Калі пачынаем глыбей аналізаваць гэту праблему, параўноўваць матэрыялы, вядомыя нам па Гальшанах, па Кернаве, па Вільні XIII стагоддзя, гэта таксама паказвае, што сярод гарадскога насельніцтва старажытнай Літвы значную частку складала славянскае. А гэта дазваляе па-іншаму паглядзець на праблему генэзу Вялікага Княства Літоўскага.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Телефон +375 17 283 15 10

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2020 г.

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 65 527 | 48 444 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 433 | 396 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 53 480 | 81 688 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 25 529 | 35 298 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 57 253 | 41 521 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 397 863 | 330 798 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 28 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 2 | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 23 911 | 23 167 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 3 709 | 3 759 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 5 257 | 5 259 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | 80 | 138 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 7 849 | 6 603 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **640 921** | **577 073** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 4 987 | 1 458 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 508 040 | 458 329 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 38 286 | 34 803 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 67 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 10 022 | 9 261 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **561 402** | **503 851** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 11 463 | 11 463 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 8 506 | 8 406 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 16 696 | 18 046 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 42 854 | 35 307 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **79 519** | **73 222** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **640 921** | **577 073** |

Форма 2

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2020 г.

**Наименование банка: ОАО «Технобанк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 21 610 | 20 181 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 10 500 | 10 020 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | | **11 110** | **10 161** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 22 073 | 18 006 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 9 923 | 6 264 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | | **12 150** | **11 742** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 280 | 12 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (29) | 184 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 24 142 | 13 338 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (174) | (34) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 10 725 | 4 298 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 4 557 | 4 312 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 30 389 | 27 891 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 1 922 | 1 593 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 9 000 | 5 933 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 362 | 1 623 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **7 638** | **4 310** |

**Председатель Правления** Д.Ю.Грузицкий

**Главный бухгалтер** Н.А.Кузьмицкая

**Дата подписания: 05 октября 2020 г.**

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта:
**https://tb.by/about/bank/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г.
УНП 100706562

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**:
открытое акционерное общество «Брестторгтехника»,
г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32

**Продавец:**
открытое акционерное общество «Брестторгтехника»,
г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32

**Предмет аукциона:**
Продажа одним лотом имущества в составе:
- капитальное строение с инвентарным номером 100/С-9449, площадью 26,3 кв. м (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад ГСМ), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32Б/1;
- капитальное строение с инвентарным номером 100/С-9450, площадью – 123,3 кв. м (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – подсобные помещения), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32Б.

Объекты расположены *на земельном участке с кадастровым номером 140100000001015433, площадью – 0,1785 га, по адресу: г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32*

**Начальная цена с НДС (20 %) – 46 642,20 бел. руб.**

*Задаток 10 % от начальной цены (4664,22 бел. руб.) перечисляется на р/с BY60BLBB30120200050732001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области, БИК BLBBBY2X. Получатель платежа: открытое акционерное общество «Брестторгтехника», УНП 200050732*

**Шаг аукциона – 5 процентов (2332,11 бел. руб.)**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Ответственное лицо: Тимошевич Дмитрий Леонидович, тел. 8 (029) 2366626

**Порядок проведения торгов**, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение торгов указаны в условиях проведения торгов, определенных в Положении о порядке организации и проведения аукционов по продаже основных средств, принадлежащих открытому акционерному обществу «Брестторгтехника», утвержденном приказом № 73/П от 22.06.2020 г., размещенном на сайте организатора торгов bresttorg.by. Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 28.08.2020 г.

**Дата и время проведения аукциона: 19.11.2020 г. в 12.00** по адресу: г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32

**Дата и время окончания приема документов: 18.11.2020 г. до 17.00** по адресу: г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 32

**Контактные телефоны: (0162) 21-55-29, (0162) 21-55-31,
e-mail: bresttorgtehnika@tut.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат»
(продавец)
проводит повторный открытый аукцион**

### ПО ПРОДАЖЕ ОБОРУДОВАНИЯ:
### комплекса бункеров К-850 для хранения зерна,

**состоящий из 22 вертикальных цилиндрических бункеров, установленных на фундаменты, 1976 года выпуска, размер одного бункера: диаметр – 5,7 м, высота – 10,35 м, емкость по пшенице составляет 150 тонн, изготовитель Petkus, Германия, расположенного по адресу: ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат», Слуцкий район, д. Знамя, ул. Колхозная, 43.**

Начальная цена с НДС (20%) **– 266 640,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**26 664,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2020, 20.08.2020.

Аукцион состоится **12.11.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.11.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.** УНП 600119098

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона
по продаже имущества
ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов»
(Продавец)**

**Лот № 1. Склад № 1, инв. № 621/С-14513, 216 кв. м. Матэрыяльная нерухомая гісторыка-культурная каштоўнасць – фальварак «Альба»:** свіран. Мінская вобласць, Нясвіжскі раён, п. Альба, вул. Завадская, 1/11 (шыфр 612Г000658), без катэгорыі, у складзе матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі 2. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, п. Альба, ул. Заводская, д. 1/11. Обременение: ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия – памятник архитектуры. Земельный участок с кадастровым номером 624283500601000197, площадь – 0,1255 га. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС – 10 821,24 бел. руб.

**Аукцион состоится 16.11.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## Извещение об открытом аукционе по продаже права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в городе Гродно 17 ноября 2020 года

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га / срок аренды | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Гродно ул. 17 Сентября, 28 | 0,6600/ 5 лет | Проектирование и строительство (реконструкция) объекта общественного назначения по индивидуальному проекту | 15 723,00 | 3 100,00 | 6 732,93 | Снос зданий, сооружений, зеленых насаждений, попадающих под пятно застройки | 1 054 080,10 |

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона. Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Гродненским горисполкомом).

В границах участка расположены существующие капитальные строения (здания нежилые, сооружения) по ул. 17 Сентября 28, 28А, 28б, 28В, 28Г, 28Д, 28Е. Необходимость сноса капитальных строений, выноса из пятна застройки инженерных коммуникаций определить проектом.

**Аукцион состоится 17 ноября 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1**.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 6 таблицы, внесенный на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000, Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 19 октября по 11 ноября 2020 года**.

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Гродненским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка Гродненский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) не позднее 2 рабочих дней после внесения соответствующих оплат.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими по согласованию с ведущим инженером коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефон для записи 8 (0152) 62-57-30.

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 72-05-37, 72-00-10.

Адрес сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета – **http://grodno.gov.by**, организатора аукциона – **http://gcn.by**




## НА КАЛЯДЫ СНЕГУ НЕ ДАПРОСІМСЯ?

...Некалі даўно, здаецца, на пачатку мінулых сямідзясятых, у нашу вёску прыехаў новы брыгадзір. Мама сказала, што знешне ён, як быццам, нішто сабе: малады, прыгожы, высокі, але ж, падобна, не вельмі разумны.

Далей быў яе расказ пра само знаёмства, пра тое, як адзін з вяскоўцаў прыйшоў на яго апошні і ледзь не з парога заявіў, што роўна праз тры месяцы, у гэты самы дзень, выпадзе першы снег і праляжыць больш сутак.

Здавалася б, ну што тут такога: незнаёмы і старэйшы за цябе чалавек нешта кажа, дык ты, прыезджы, паслухай і, можа, прамаўчы: выпадзе снег дык выпадзе (хоць яму і ранавата яшчэ)...

Аднак гэты новы начальнік не з такіх, не з памяркоўных быў. Дзядзьку Зыгмунда ён проста на смех падняў: во, маўляў, свой празорца знайшоўся! Зараз прагнозы можна не слухаць, у газетах не чытаць...

І палова бяды, каб ён пасмяяўся ды забыўся, а то ж не! Амаль пры кожнай сустрэчы пад'юджваў дзядзьку, цікавіўся, ну што там заўтра чакаецца? Можа, патоп? Ці землятрус? Прычым пытаўся не толькі з вока на вока, але і пры іншых людзях. Я сама таму сведкай.

Помню, у апошнюю пятніцу жніўня мы з татам у Вільню паехалі. Бачым, брыгадзір, таксама туды кіруецца ў акружэнні дзяўчат... Здавалася б, каму-каму, а ім дакладна не да снегу, але ж хлопец і тут не змаўчаў, знайшоў магчымасць, успомніў дзядзькаў прагноз:

— Вы ж як у горад прыедзеце, — стаў раіць сяброўкам, — дык адразу бяжыце па крамах, кажухі купляйце, бо восень сёлета зусім кароткая будзе. Праз пару тыдняў снег ляжа — ну па самыя вашы калені! Дзядзька Зыгмунд дакладна абяцаў...

І ха-ха-ха на ўсё горла!

Тут тата не вытрываў.

— Слухай, хлопча, можа, табе лепш памаўчаць? — спытаў у брыгадзіра. — Ну праўда: чакаць засталося зусім нядоўга... Тады ўжо і пасмяешся. А пакуль... Думаеш, калі ты з дыпломам, дык самы разумны тут? Можа... Хай бог дае! Але што ты, браток, запяеш, калі снег і напраўду пойдзе?

— Як гэта пойдзе? — засмяяўся ў адказ брыгадзір. — Адкуль?

— З неба, — спакойна адказаў яму тата.

І як у ваду паглядзеў, бо ў «назначаную» дзядзькам раніцу ўсё і сапраўды пакрылася белай пуховай коўдрай, у зімовыя снежныя «шапкі» прыбраліся чырвоныя вяргіні, яблыкі... Зямлю вакол стала проста не пазнаць! Бедны брыгадзір хадзіў па ёй, быццам мыла з'еўшы: не мог зразумець, ну адкуль той Зыгмунд мог ведаць пра першы снег?

А тата над гэтым пытаннем галаву не ламаў, хоць надвор'е прадказваў лепш за гідрамет: узяў ды проста спытаўся.

Як і варта было чакаць, спадар Зыгмунд з ахвотай адказаў, што зрабіць прагназ наконт першага снегу здольны той, хто жыве каля рэчкі і любіць за ёй назіраць. А значыць, можа заўважыць, як на ваду падаюць белыя летнія матылі, як пакрываюць яе нібы коўдрай... Праз тры месяцы пасля гэтага — дзень у дзень — пойдзе снег і пратрымаецца роўна столькі, колькі праляжыць «покрыва».

...Сёлета, на жаль, я яго не бачыла. І таму, відаць, што да рэчкі хадзіла не кожны дзень — мне далекавата...

Дык можа, некаму іншаму з народу, што на нашым «провадзе», гэта бліжэй? Можа, ён бачыў ваду, белую ад матылёў, і запомніў, якога чысла? То няхай напіша. Будзем ведаць, калі нам чакаць снегу.

**Ганна Кагарка,**
*м. Яцыны, Астравецкі раён.*

## ...А ГРОШЫ МОЖНА НА ВЕЦЕР

У мяне цікавы ўзрост: як бы і не старасць яшчэ, але ўспамінаў!.. Азірнешся назад — канца-краю няма! Недзе там, у далёкай далечы, няпростае маленства, піянерыя, камсамол, пяцігодкі і сямігодкі, упэўнены шлях да камунізму, потым — застой, перабудова, чарнобыльская трагедыя. А цяпер гэты вірус з «каронай»... Колькі людзей перахварэла ў Кітаі, Італіі, у далёкіх Штатах! І бліжэй — у Польшчы, Расіі, Украіне, у нашых гарадах і сёлах... Побач гэтая зараза — не дай бог падчапіць... У любым узросце. А ўжо ў маім... І з возам хвароб...

Карацей, я адразу і з вясны яшчэ, стала ратавацца.

Першае, што зрабіла, нашыла масак, бо ў продажы іх не было. Прычым не з тоненькай марлі, якая можа хутка парвацца, а з баваўны і ў некалькі столак. У такой куды хочаш ідзі, а дамоў вярнуўся, вымый-пракіпяціў, пакуль зноў у дарогу, глядзіш, і высахла. На ўсякі выпадак можна прасам прайсціся...

Пачула яшчэ, што пальчаткі патрэбны. Знайшла гумавыя, гаспадарчыя, надзела, села на ровар, прыехала ў вёску. У мяне там хата, гарод, якая-ніякая гаспадарка: гусі, куры, каты, сабака... Значыць, трэба хуценька здымаць пальчаткі і за справы?

Ды не тут тое было: рукі спацелі, гума да іх прыліпла — правая пальчатка тут жа парвалася... Вырашыла, што наступны раз — замест тонкіх аднаразовых — лепш надзяваць баваўняныя. Адна праблема: што далей з імі рабіць, як вірус «выдаліць», калі падчапіўся? Можна як быццам таксама пракіпяціць, потым папрасаваць, але ж гэта клопат... А што, думаю, калі ў духоўку іх, як тыя ж слоікі для нарыхтовак: наставіў, газ уключыў...

Такім жа чынам можна і манеты апрацаваць: яны ж праз колькі рук праходзяць, вірусы збіраючы?!.

Пытанне заставалася, што з папяровымі грашамі рабіць? Можа, у мыйны парашок пакласці? А што — хімія ж служыць народу? Значыць, вірус дакладна заб'е — за суткі? Ці лепш за двое?

Словам, я, здаецца, усё прадугледзела, але ж перш чым пра свае прыдумкі сыну з нявесткай расказаць, каб з іншымі людзьмі падзяліліся, вырашыла ўсё праверыць.

Пачала з пальчатак. Дзве пары палажыла ў духоўку, побач — металічныя грошы. Закрыла дзверцу, уключыла газ — рада: працэс пайшоў.

Я таксама пайшла, недалёка — у пакой... Каб выцерці пыл. Гэта ж мігам, калі не захапіцца...

Я, здаецца, перастаралася, бо пакуль выцірала, нейкі пах з'явіўся. Думала, з вуліцы, а гэта... з кухні маёй, з духоўкі. Дзве пальчаткі там да дзірак пратлелі, дзве іншыя — толькі пafрыжэлі. Манеты — засталіся цэлыя, хоць і ў крапінку.

І папяровыя грошы (для эксперымента я выбрала драбнейшыя) таксама амаль не пацярпелі: хіба скукожыліся крыху і шалясцяць не так ад уздзеяння мыйнага сродку... Што іх не псуе: у крамах, бачу, і не такія бяруць, не такія даюць. Галоўнае, каб без віруса!

...Такім вось чынам (пальчаткі «варацца» і сушацца, грошы, кашалёк і вопратка на тры-чатыры дні «пускаюцца на вецер», то-бок адлежваюцца на балконе, плюс аптымізм і гумар) я з вясны ратавалася ад «ковіду».

Цяпер з ім, вядома ж, працсей: у аптэках і маскі, і пальчаткі, і антысептыкі... (Я адразу купіла маленькую бутэлечку з пульверызатарам і вялікую — каб было чым яе запраўляць — і ўзяла за правіла: выйшла з пад'езда, рукі апрацавала і паехала (апроч сваёй вёскі, болей нікуды.) На месцы ровар паставіла, зноў за антысептык, каб «прайсціся» па ключах, тэлефоне, ручках дзвярэй...

У крамы заходжу ў масцы і трымаю дыстанцыю, рукі мыю... Берагуся, карацей, сама і тым самым берагу ад хваробы іншых. Пакуль жыву, чаго шчыра жадаю ўсім, бо яно ж праўду кажуць, што выратаванне тапельцаў справа рук іх саміх — найперш?!

**Тамара Новік,**
*г. Клецк.*

## ДАГНАЎ — НЕ ДАГНАЎ,
### а прабегчы... варта!

Некалі даўно, у мінулым стагоддзі і яшчэ да тэлевізараў, Юзік, муж маёй суседкі, паехаў у горад да шваґра. Можа, спланаваў так, можа, чарку лішнюю ўзяў, — факт, што застаўся начаваць, а назаўтра — дома ж работы процьма — рана раніцай падхапіўся, каб паспець на першы аўтобус. Еў-не еў там што — выскачыў з дому, хуткім крокам пашыбаваў на вакзал. Але ж пры гэтым пачуў яшчэ, што ў яго за спінай гучна ляпнулі дзверы. Азірнуўся — услед за ім з пад'езда мужчына выбег у... трусах і ў майцы. «Няйначай гоніцца!» — спужаўся Юзік і на ўсякі выпадак кінуўся ўцякаць.

Сілы, трэба сказаць, былі няроўныя: адлегласць паміж мужчынамі імкліва скарачалася. «Зараз, зараз ён дагоніць мяне, — баяўся першы, — зараз нечым агрэе (інакш — чаго б ён з хаты выскакваў?!), але за што? Я ж нікому ніколі нічога такога...»

Думаў, бедны, вось так і зайцам азіраўся на баках — шукаў хоць нейкага паратунку.

На ягонае шчасце брамка ў адзін з падворкаў (у так званым прыватным сектары) была расчынена. Юзя мігам «нырнуў» туды і нават зашчапіўся! Той, хто гнаўся за ім, пранёсся міма.

«Няўжо абышлося?» — не мог паверыць Юзік, спрабуючы аддыхацца, і... нічога не разумеючы, бо, калі выйшаў на вуліцу, зноў убачыў таго вар'ята ў трусах: ён нёсся ў бок дома шваґра.

...Што цікава, на аўтобус Юзя тады паспеў, дамоў даехаў, аднак пра гэту прыгоду не сказаў анікому. Хіба праз месяц-другі — таму самаму гарадскому шваґру.

Думаў, ён штось патлумачыць, дык не — на смех вяскоўца падняў. Сказаў, што бягун той — з іхняга пад'езда, што па раніцах, каб у форме быць, ён спортам займаецца — робіць спецыяльныя размінкі. «Што? — вушам не паверыў Юзік. — Размінкі? У трусах?.. Ды каб яго сонца не грэла!.. Каб на беразе ўзяў і ўтапіўся! Іншага спосабу няма, — трэба людзей палохаць»...

Раней дзеля той «формы» і здароўя людзі сапраўды болей працавалі. Цяпер — і бегаюць, і на роварах катаюцца, і з палкамі ходзяць, а ўсё роўна хварэюць. Вось што здзіўляе!

**Яўгенія Кулевіч,**
*Смаргонскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# МАТЧЫНА СЭРЦА
## Невясёлыя думкі пасля прыгожага свята

ТАК незнарок супала — акурат перад Днём маці трапілі мне ў рукі два лісты. Напісаныя акуратным почыркам, які можа быць толькі ў былых настаўніц, яны прыйшлі з розных раёнаў адной вобласці. У іх — просьба дапамагчы вырашыць нейкія праблемы. Але больш усё-ткі споведзь жанчын, якія маюць найвялікшае шчасце і няшчасце быць маці. Я перачытвала іх некалькі разоў, старалася пасля не браць да галавы гісторыі, па сутнасці, незнаёмых мне людзей, але яны-такі падарылі мне бяссонную ноч, у якой было шмат розных думак і разваг. І я рашыла, што пра іх напішу, бо гісторыі гэтыя, нягледзячы на сваю непадобнасць, тыповыя. Тое, аб чым старающа маўчаць. Тое, аб чым плачуць ноччу ў падушку або дзеляцца з самымі блізкімі людзьмі (ці, калі ўжо зусім няма сіл трываць, — са спадарожнікам у вагоне або з газетай, якую чытаюць). Тое, аб чым баліць матчына сэрца.

СПАДАРЫНЯ Валянціна (імёны я змяніла, не яны тут галоўнае) дбае пра працаўладкаванне свайго дарослага сына. Хлопец нежанаты, жыве з ёй дома, не адзін год працаваў качагарам у мясцовай школе. У наступны сезон з ім не заключылі новы дагавор, адказаўшы, што, маўляў, летам адмовіўся прыйсці разгружаць брыкет. На яго месца хутка ўзялі новага чалавека — на вёсцы з работай нягуста. Яму ж нібыта сказалі: маўляў, не прападзеш, матчына пенсія ёсць. А маці пайшла абіваць парогі, прасіць за крывінку — спачатку ў раён, потым на прамую лінію ў аблвыканкам званіць стала. Там паабяцалі паведаміць пра вынікі ў панядзелак. Два панядзелкі яна не адыходзіла ад тэлефона. Пасля напісала нам: маўляў, ніхто не пазваніў, сын так і застаецца без работы, а я, можа, і не дажыву — вельмі цяжка хварэю...

